Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletariusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
штодзённая газэта

СУБОТА
15 КАСТРЫЧНІКА 1932 г.
№ 289 (3608)

Сеньня у нумары

Артыкулы—ПЕРАДАВЫ. За 191 тыс. тон бульбы пралетарам гораду Леніна.
А. ЧАРВЯКОЎ. Задачы таварыства «Прэч непісьменнасьць» на новым этапе. (4-я стар.).
АБ ВЫНІКАХ ВЕРАСЬНЕЎСКАГА ПЛЕНУМУ ЦК І ЗАДАЧАХ МАСКОЎСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ. З дакладу тав. Кзгановіча на пленуме МК і МГК сумесна з сакратарамі райкомаў вобласьці і актывам Маскоўскай арганізацыі УсеКП(б) (2 стар.).
Адначасова з уборкай—адгружаць бульбу. (1 стар.).
100 проц гадавога пляну збожжазагатовак да XV гадавіны Кастрычніка (1 стар.).
ПЕРАКЛЮЧЫЦЬ МТС НА БАРАЦЬБУ ЗА ЗЯБЛІВА (3 стар.)
Сёньня адкрываецца III Усебеларускі зьезд т-ва «ПН» (3 стар.).
ЗА ГРАНІЦАЙ (4 стар.).

За 191 тыс. тон бульбы пралетарам гораду Леніна

БССР павінна адгрузіць ленінградзкім рабочым у гэтым годзе 191 тыс. тон бульбы. Беларусь павінна даць пралетарам гораду Леніна ня менш 30 проц. усёй гадавой яго патрэбы ў бульбе. Гэта задача вялікага гаспадарчага і палітычнага значэньня.

З гэтага пункту погляду вялікае значэньне мае апублікаваная пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б ад 11 кастрычніка аб адгрузцы бульбы Ленінграду. Барацьба за рэалізацыю гэтай пастановы павінна стаць у цэнтры ўвагі партыйных, прафэсіянальных, каапэрацыйных і загатоўчых арганізацый. Асаблівая роля прыпадае на саветы і зямельна-калгасныя органы, якія павінны арганізаваць масы калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў на барацьбу за пасьпяховае завяршэньне ўсіх трох элемэнтаў рэалізацыі ўраджаю гэтага году—капаньне бульбы, загатоўка яе і адгрузка пралетарскім цэнтрам.

Забясьпечыць посьпех у выкананьні задачы па адгрузцы бульбы—гэта значыць у першую чаргу фарсаваць тэмпы бульбаўборачнай кампаніі. А між тым плян уборкі на 10 кастрычніка выканачы па БССР на 80,4 проц. Ня трэба даводзіць, што гэта мала, што лічба процанту выкананьня пляну адбівае недастатковасьць тэмпаў, вялісьць у рабоце асобных калгасных арганізацый і недастатковую масавую растлумачальна-выхаваўчую работу, якая павінна весьціся партыйнымі арганізацыямі і саветамі.

Хто не дае расьці нятухілна і шпарка ўверх крывой уборцы?

Гэта тыя раёны, дзе арганізацыя бульбаўборкі пастаўлена дрэнна і дзе мала ўвагі аддаецца брыгадзе і барацьбе са стратамі. Ня ўсюды засвоілі, што брыгада і толькі яна выяўляецца асноўнай і адзінай формай арганізацыі працы, што брыгада адказвае за ўсе стадыі барацьбы за ўраджай: сее, вырошчвае і ўбірае. Рад калгасаў гэтага не зразумелі і лепшы вопыт брыгад, які накапіўся пры сяўбе і ўборцы збожжа, не пераносяць на ўборку бульбы. Нямы чаго і казаць, што такая пастаноўка справы, калі аб брыгадзе, аб зьдзельшчыне і аб цьвёрдай норме забываюць—нічога агульнага з лініяй партыі ў калгасным будаўніцтве ня мае. Жывыя факты з практыкі ўборкі апошніх дзён усё гэта пацьвярджаюць.

Адваротнае мы назіраем у тых выпадках, калі на брыгаду звараччаецца максімум увагі. У калгасе імя Леніна, Мушынскага сельсавету дзякуючы правільнай арганізацыі працы ўборка бульбы ўжо цалкам закончана. Адзін гектар выбірала брыгада ў 18 чалавек, замест 23-25, прадугледжаных нормамі. У гэтым-жа калгасе выкананы плян загатовак.

Зусім недапушчальным зьяўляецца існаваньне разрыву паміж капаньнем і загатоўкай, а такі разрыў існуе. Надаўна яшчэ сельсаветы Аршанскага раёну ўрачыста абяцалі закончыць капаньне бульбы цалкам да 1-га кастрычніка. Свайго слова яны ня стрымалі. Да 10 кастрычніка ня выканалі плян на 77,4 проц. Здавалася-б, што і в такой колькасьці загатоўка і адгрузка магла-б быць на ¾ выканана. Адкуль тут справа пастаўлена яшчэ горш. Не жадаючы спалучаць капаньне і загатоўку бульбы сельсаветы Аршанскага раёну плян загатовак выканалі на 12,2 проц., а плян адгрузкі ў пралетарскія цэнтры—на 20,6 проц.

Адсюль вынікае, што цэнтральная задача ўсіх партыйных, савецкіх і каапэрацыйных арганізацый—гэта спалучэньне фарсаванага капаньня бульбы, загатоўкі і адгрузкі. Уборка павінна быць закончана ў вызначаныя ўстановленыя тэрміны. Умацоўваючы брыгаду, як важнейшае звяно арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і асноўны мэтад арганізацыі працы, устанаўліваючы цьвёрдыя нормы колькасьці бульбы з гектара на брыгаду, кіруючы чотка і апэрацыйна—саўгасы і калгасы павінны правесьці ўборку з мінімальнымі стратамі. Не забываць, што барацьба са стратамі застаецца ня менш важнай задачай і на гэтым вучастку сацыялістычнай сельскай гаспадаркі. 20 проц. страт на ўраджаі, якія мы церпім з-за неахайнага капаньня—ганьба для гаспадаркі бульбяных фэрм і калгасаў. Двойчы прайсьці па полі, стараннa ўбраць і тут-жа бульбу сартаваць—такімі зьяўляюцца асноўныя ўмовы, якія гарантуюць мінімум страт. «Ніводнага кілёграма бульбы ў полі»—з такім лёзунгам павінна быць закончана ўборка аднаго з самых важных сельска-гаспадарчых прадуктаў нашай рэспублікі.

Ці праходзяць здавальняюча загатоўкі? На гэтае пытаньне адказвае зводка. На 10 кастрычніка плян загатоўкі па сыстэмах БКПГ і БПГ выкананы на 28,9 проц. Асноўная прычына незадавальняючага ходу загатовак (апрача недастаткова хуткага капаньня)—гэта слабасьць арганізацыйна-масавай работы раённых арганізацый. Бязумоўна, што ў гэтым годзе пралетарская і калгасная прамадкасьць мабілізавана менш актыўна, чым у мінулым годзе, калі загатоўка і адгрузка бульбы Ленінграду захапіла ўсе грамадзкія арганізацыі, калі гэта было справай гонару калгасаў, саўгасаў і транспарту. Ня гледзячы на назіраемыя ўсіх магчымасьцяй і нават некаторых зрываў за апошнія дні мы яшчэ гэтага не дамагліся ў поўнай меры. А дамагчыся гэтага можа БССР свой доўг перад рабочымі Ленінграда бязумоўна выканае з гонарам.

Трэба ліквідаваць адставаньне асобных раёнаў. У першую чаргу гэта датычыцца раёнаў: Вушацкага, Нараўлянскага і Бялыніцкага, (якія на 1 кастрычніка нічога не загатовілі) і да раёнаў: Бешанковіцкага, Лепельскага, Чавускага, Прапойскага, Расонскага, Сеньненскага, Барысаўскага, Полацкага, Віцебскага і Ўраравіцкага (якія выканалі плян загатоўкі ня больш 3 проц.). Адставаньне гэтых раёнаў тым больш становіцца незразумелым, калі ўлічыць, што яны дайшлі да 78-80 проц. выкананьня пляну ўборкі. Савет народных камісараў БССР і ЦК КП(б)Б у пастанове ад 11 кастрычніка зусім вычарпальна вызначыл характар арганізацыйных мерапрыемстваў у мэтах фарсаваньня тэмпаў уборкі, загатоўкі і адгрузкі бульбы. Такія-ж мерапрыемствы павінны быць безадкладна праведзены ў раёнах. Трэба стварыць тройкі апэрацыйнага кіраўніцтва адгрузкі, непасрэдна з поля пасьля ўборкі транспартаваць бульбу на прыёмачныя пункты, з пунктаў на станцыі. Тэрміновымі маршрутамі, з хуткасьцю 400 клм. у суткі ў парадку першачарговых перавозак—бульба павінна трапіць у пралетарскія цэнтры. Такім зьяўляецца той кавэсэр, які трэба паладзіць.

У гэтай важнай рабоце вялікае месца павінны займаць саветы, камсамол і друк. Яны павінны быць арганізатарамі сацыялістычнага спаборніцтва раёнаў, калгасаў і загатопунктаў. Нізавы друк пытаньне адгрузкі бульбы не павінен упускаць з поля зроку ні на адну мінуту, бо перамога на гэтым вучастку вырашаецца кожны дзень і кожную гадзіну.

Ад чоткай работы чыгуначнага і водзнага транспарту залежыць своячасовае заканчэньне ўсяго ходу адгрузкі бульбы пралетарскім цэнтрам. Вось чаму ўпаўнаважаны Наркамшляхоў знаёін тав. Эгле павінен безадкладна забясьпечыць бесьперабойную падачу вагонаў для адгрузкі. Тое-ж самае павінен правесьці ўпаўнаважаны Наркамводу тав. Пачэпуда ў адносінах перавозкі бульбы водным шляхам. Пастанова СПА ад 10 верасьня аб эканамічным рэгуляваньні перавозак бульбы па транспарце павінна быць праведзена ў жыцьцё безадкладна. Гэта значыць, што трэба спыніць усякіх перавозкі бульбы без дазволу апэрацыйнай шасьцёркі СНК і ЦК да выкананьня цэнтралізаваных пляноў.

Барацьба са стратамі і за высокую якасьць бульбы вырашаецца ня толькі ў момант уборкі, але і пры перавозках. Трэба ўлічыць вопыт мінулага году, калі бульба ў 2165 вагонах мела істотныя недахопы (марожаная, гнілая, сапрэлая, дробная і мэханічна пашкоджаная).

Мы патрабуем стандарту сталовай бульбы,—гэта значыць сьпелая, сухая бульба, без дамешкі зямлі і саломы. Барацьбу за якасьць весьці ўжо на пунктах, дзе варта ўстанавіць сартаваньне і ачыстку. У дарозе захоўваць бульбу ад сьмедзьня, рэзкіх вагчыняў тэмпэратуры і ад дажджу. Трэба ўлічыць, што калі нават захаваць стандарт у 0,5 проц. пабочных дамешак, дык для гэтага патрэбна будзе 68 вагонаў. 955 тон мы трацім на дамешках, а мы-ж далёка не захоўваем стандарту, значыць мы трацім у 2-3 разы больш. Больш 3 тыс. вагонаў для перавозкі сьмецьця!

Разгортваючы барацьбу за поўнае выкананьне пляну адгрузкі бульбы Ленінграду, партыйныя савецкія і загатоўчыя арганізацыі павінны ўлічыць тое, што загатоўкі праходзяць ва ўмовах калгасавы вораг—кулак імкнецца ўсімі мэтадамі сарваць пасьпяховае выкананьне важнейшых гаспадарча-палітычных мерапрыемстваў. Кулацкая агентура агітуе за тое, каб раней вывозіць бульбу на рынак перакупшчыку і спэкулянту, а не прадаваць дзяржаве. Кулак затрымлівае пасьпяховы ход уборкі, шкодзіць нам у барацьбе за якасьць і, нарэшце, імкнецца сарваць загатоўкі, распаўсюджваючы сацыялістычную маемасьць. Зьвілістасны адпор гэтым спробам кулацтва сарваць мерапрыемства, якое накіравана на палепшаньне матар'яльнага становішча пралетараў Ленінграду.

У некаторых мясцох у сувязі з загатоўкамі і адгрузкай бульбы Ленінграду існуе тэндэнцыя спыніць самазагатоўкі для патрэб забясьпечаньня рабочых у межах БССР. Трэба растлумачыць, што выкананьне цэнтралізаванага пляну ня можа быць супроць пастаўлена самазагатоўкам. Фарсаваць работу па загатоўцы і адгрузцы бульбы Ленінграду! Шырэй разгортваць самазагатоўкі ў глыбінных пунктах.

Мы ўступілі ў рашаючыя дні выкананьня пляну адгрузкі бульбы. Вось чаму ў цэнтр увагі павінна быць пастаўлена барацьба за бальшавіцкую рэалізацыю наступнага ўказаньня СНК і ЦК КП(б)Б: «...капаньне, загатоўка і вывазка бульбы ў Ленінград павінны праходзіць як адна з буйнейшых гаспадарча-палітычных задач, якая стаіць ня толькі наравне з усімі загатоўкамі, але як першачарговая задача сёньняшняга дня».

100 проц. ГАДАВОГА ПЛЯНУ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК ДА ХУ ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА

Множыць вопыт лепшых

Члены Смаліцкага сельсавету ЛЕБЕДЗЕЎ ПЁТР і МІХАЛКОВІЧ ТАМАШ праз арганізацыю ўдарных брыгад дамагліся поўнага выкананьня плянаў на сваіх вучастках

Палепшыць работу прыёмачных пун таў

Быхаў. (Ад нашага спэцкора). Збожжазагатоўкі па раёне праходзяць зусім нездавальняюча.

На 9-е кастрычніка гадавы плян збожжазагатовак выкананы ўсяго на 29,8 проц., калгасы выканалі свой плян на 45,7 проц., аднаасобнікі—25,1 проц., а кулацка-заможная гаспадарка на—25,3 проц.

50 проц. агульнага гадавога пляну збожжазагатовак павінен быў даць раён да 1-га кастрычніка, аднак гэтай лічбы раён не дасягнуў і на 9 кастрычніка.

Глускі сельсавет, як самы вялікі сельсавет раёну, павінен даць 6 проц. агульнараённага гадавога пляну збожжазагатовак, аднак тыя тэмпы работы, якімі зараз працуе сельсавет, гавораць аб тым, што пры такой рабоце плян ня будзе выкананы да вызначанага тэрміну.

У Глускі сельсавет,—як рашаючы вучастак збожжазагатовак па раёне накіравана выязная рэдакцыя раённай газэты «Маяк камуны». Выязная рэдакцыя разгарнула ў сельсавеце даволі вялікую масавую работу, у выніку чаго некаторыя калгасы і вёскі поўнасьцю ўжо выканалі гадавы плян збожжазагатовак.

Выязной рэдакцыяй праведзены сходы па калгасах і вёсках з абгаварэньнем адозвы аднаго з перадавых калгасаў раёну «Кім» і ліста ленінградзкіх рабочых.

7-га кастрычніка па ініцыятыве выязной рэдакцыі быў арганізаваны чырвоны абоз са збожжам, у якім калгасы «Ударнік», «Будзёны», «Камуна» і «XII Кастрычнік» поўнасьцю завяршылі плян збожжазагатовак

Дрэнна працуюць у Быхаве збожжапрыёмачныя пункты. Ёсьць выпадкі, калі калгасьнікі і аднаасобнікі, не дачакаўшыся здачы свайго збожжа, вымушаны былі весьці збожжа назад і прывозіць яго ў наступны дзень.

Культурнае абслугоўваньне збожжаздатчыкаў пастаўлена з рук вон дрэнна.

У раёне ёсьць усе магчымасьці для поўнага і своячасовага выкананьня пляну збожжазагатовак гэтага году. Аб гэтым сьведчаць факты добрай работы перадавых сельсаветаў раёну, як: Кучынскі, Грудзінскі і Чачэвіцкі, якія ўвесь час ідуць упераздзе ўсіх сельсаветаў раёну, паказваючы добрыя ўзоры работы.

Збожжазагатоўкі зараз у раёне знаходзяцца ў самым разгары. Амаль кожны дзень з розных сельсаветаў прыходзіць шмат фурманак са збожжам. Ідуць і чырвоныя калгасныя абозы.

РК КП(б)Б і РВК трэба прыняць усе захады для таго, каб усё прывезенае збожжа было своячасова прынята збожжа-прыёмачнымі пунктамі. Трэба таксама паклапаціцца аб культурным абслугоўваньні збожжаздатчыкаў.

Набліжаецца XV гадавіна Кастрычніка. Справай гонару ўсіх партыйчэек і сельсаветаў павінна стаць поўнае выкананьне пляну збожжазагатовак да гэтага вялікага сьвята.

С. Тумарынсон.

Зменшаемся за поўнае выкананьне заданьня да XV гадавіны

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА. (Белта). Правільная бальшавіцкая барацьба за збожжа раённай партыйнай арганізацыі дала магчымасьць дабіцца зруху ў збожжазагатоўках. На 5 кастрычніка гадавы плян выкананы па раёне на 57,2 проц. Асабліва дапамог у гэтым конкурс на лепшага збожжаздатчыка—калгасу і кантрактанта, які быў абвешчаны раённымі арганізацыямі. Раённая конкурсная камісія апэрацыйна кіруе конкурсам, вядзе сталы вучот здатчыкаў-кантрактантаў, вызначае прэміі, выдае ўдарныя кніжкі тым, якія пасьпяхова выканалі свае абавязкі перад дзяржавай.

Ва ўсіх сельсаветах раёну праведзены зьлёты ўдарнікаў-збожжаздатчыкаў, кантрактантаў аднаасобнікаў і калгасьнікаў. У кожным па селішчы і дзесяцідвор'і адказнымі членамі сельсавету арганізаваны ўдарныя брыгады з лепшых збожжаздатчыкаў для дапамогі ў выкананьні пляну. Так, па Смалявіцкім сельсавеце, член сельсавету Лебедзь Пётра арганізаваў у паселішчы Воўка ўдарную брыгаду з лепшых здатчыкаў кантрактантаў—Раманенскі Я., Падневіч Я., Мілешка Мікалай, Падневіч Х. і Хартковіч Даніла. У выніку работы гэтае брыгады гадавы плян на вучастку выкананы на 100 проц. Такую-жа ўдарную работу па сваім вучастку правёў член сельсавету Міхалковіч Тамаш, які арганізаваў брыгаду з лепшых збожжаздатчыкаў кантрактантаў — Кандраценя Хведара, Кандраценя Мікалая і Сергіені Рамана, якія дамагліся выкананьня гадавога заданьня па сваім вучастку на 95 проц. Дзякуючы гэтым мэтадам работы гадавы плян па Смаліцкім сельсавеце ўжо выкананы на 90 проц. Гэтымі-ж мэтадамі праводзяць загатоўкі і Чапліцкі сельсавет, які выканаў плян на 74,2 проц. і Жылікаўскі сельсавет—60 проц. гадавога заданьня.

Чырвона-Слабодзкі раён бярэ на сябе абавязак да ХУ гадавіны Кастрычніка рапартаваць партыі і ўраду аб поўным выкананьні гадавога пляну збожжазагатовак.

„Няма часу выконваць збожжазагатоўкі"

Плян збожжазагатовак па Заслаўскім раёне выконваецца зусім дрэнна, асабліва па Слабодзкім і Заслаўскім сельсаветах. Гэта зьяўляецца простым вынікам адсутнасьці масавай работы сярод бядняцка-серадняцкай часткі вёскі. Няма нацэку на кулацка-заможныя гаспадаркі. Карыстаючыся гэтым, кулак усімі спробамі імкнецца як мага хутчэй хлеб разбазарыць. Аднак, сельсавет аб гэтым нікольскі ня турбуецца. Паасобныя члены яго проста садзейнічаюць такому разбазариваньню збожжа. Так, з в. Тартак (Старасельскі сельсавет) тры кулацка-заможныя гаспадаркі да 20 верасьня г. г. ня здалі ніводнага кілё збожжа. З боку члена сельсавету тав. *Мацкевіча* ня былі ўжыты ніякія захады. да таго, каб прымусіць іх зрабіць гэтае. Калі старшыня сельсавету запытаўся ў т. *Мацкевіча*—чаму не здаюць гэтыя гаспадаркі збожжа,—ён адказаў, што «ім няма часу, яны яшчэ малоцяць і сеюць». Калі старшыня сельсавету катэгарычна прапанаваў Мацкевічу выканаць плян збожжазагатовак, дык Мацкевіч катэгарычна адмовіўся. «Я,—кажа Мацкевіч,—ведаю, што ім няма часу і ніякіх захадаў ужываць ня буду». Вось твар ак тыўнага абаронцы кулакоў.

Старасельскаму сельсавету трэба ўжыць самыя суровыя захады да Мацкевіча за зрыў збожжазагатовак і садзейнічаць у гэтым кулацка-заможным гаспадаркам.

Дзямешчыка.

Інфармацыйнае паведамленьне

13-га кастрычніка адбыўся пленум Менгаркому КП(б)Б. Пленум абраў таварыша ЧАРНУШЭВІЧА А. адным з сакратароў ГК, кааптыраваўшы яго ў склад членаў пленуму, бюро і сакратарыяту ГК КП(б)Б.

Тав. Чарнушэвіч А.-сэкратар Менгаркому КП(б)Б

Тав. *Чарнушэвіч:* сын селяніна, беларус, нарадзіўся ў 1899 г. у м. Копылі (б. Менскай губэрні).

У рады КП(б)Б тав. *Чарнушэвіч* уступіў у сакавіку 1920 г. у часе белапольскай акупацыі. Працаваў у падпольлі да прыходу Чырвонай арміі. У падпольлі тав. Чарнушэвіч прымаў актыўны ўдзел у арганізацыі і рабоце партызанскіх атрадаў.

У 1920 г. тав. Чарнушэвіч мабілізуецца Цэнтральным бюро КП(б)Б на выкананьне прадразьвёрсткі. У 1921 г. мабілізаваны на барацьбу з бандытызмам у прымежных раёнах б. Случчыны. Там-жа працаваў сакратаром Чырвона-Слабодзкага валкампарту і ў органах міліцыі да 1924 г.

У 1924 г. тав. Чарнушэвіч выбіраецца сакратаром Грэскага РК КП(б)Б, у 1926 г.—загадчыкам аргаддзелу Слуцкага АК КП(б)Б, у 1927-28 г.—загадчыкам аргаддзелу Бабруйскага акруговому, у 1928-30 г.—загадчыкам аргаддзелу Віцебскага акруговому КП(б)Б, у 1930 г.—сакратаром Магілеўскага акруговому КП(б)Б

З лістапада 1930 г. і да апошняга часу тав. Чарнушэвіч працаваў загадчыкам культпропам ЦК КП(б)Б.

Бульба—Ленінграду

АДНАЧАСОВА З УБОРКАЙ--АДГРУЖАЦЬ БУЛЬБУ

Зводка па адгрузцы бульбы

На 10-Х 1932 г. (у тонах і проц.).

	Плян	За дзень	З пачатку кампаніі	Процант выкан.
БКПБ	110000	2296	35851	32,5
БПГ	54000	1079	11634	21,5
Разам	164000	3372	47485	28,9
ЛССР	91000	2118	28821	31,7
Дар. ТСТ Кастр.	8000	120	1858	25,2
Дар. ТСТ Мурман.	5500	—	2412	43,8
Дар ТСТ Водзікаў	500	—	—	—
Севзапсаюз	5000	55	2607	52,2
«Лентоспарніт»	16000	121,4	2758	17,3
«Ленінпш агорт»	7 00	48,6	1768	24,6
СПС	7000	133,5	2010	29,2

Поўнасьцю выканаць плян да 1 кастрычніка

СТАРЫЯ ДАРОГІ. Пераважная большасьць калгасаў раёну правільна зразумелі, што ранькія тэрміны ўборкі бульбы вырашаюць пытаньне барацьбы са стратамі. Умела, па-бальшавіцку, яны спалучылі рад асеньніх работ з ударным, датэрміновым скончаньнем бульбаўборкі.

Калгасы «Расьсьвет новага жыцьця», «Х-ты Кастрычнік», «Герой працы», імя Сталіна, «Штурмавік», «Камінтэрн», «Чырвоная Крынка», «Шлях Леніна», «Чырвоны пуцілавец» і шмат іншых ўборку бульбы закончылі да 10 кастрычніка, арганізаваўшы бараннаваньне і пераворваньне бульбяніча. Усе калгасы Нова-Дароскага і Дараганаўскага закончылі бульбаўборку, паставіўшы барацьбу са стратамі ў цэнтр увагі.

Узор бальшавіцкай работы паказвае калгас «Чырвоны пуцілавец». Ён поруч з бульбаўборкаю ударна закончыў у тэрмін сяўбу азімых, спалучыўшы гэтыя работы з расьпілам і ўздымам лёнатрасты, ворывам пад зяб, ўборкаю гародніны.

Загатоўчыя раённыя арганізацыі —райзаг, Белплодагародніна — ня выкарысталі посьпехаў бульбаўборкі для разгортваньня бальшавіцкіх тэмпаў загатовак. Паміж уборкай і дастаўкай бульбы на загатоўчыя пункты існуе вялікі недапушчальны разрыў.

Асабліва прывожнае становішча з адгрузкаю бульбы Ленінграду. Усяго патрэбна адгрузіць да 20 кастрычніка 1.061 тон, адгружана толькі 382 тон, што складае 36 проц. пляну. Асабліва недапушчальна адстаюць сельсаветы Крываносаўскі (15 проц.) і Шчыткаўскі (20 проц.).

Паміж рознымі загатоўчымі арганізацыямі існуе «канкурэнцыя», перахватваньне бульбы. Белплодагародніна 9-га кастрычніка перахапіла 6 падвод бульбы, якая павінна была быць адпраўлена ў Ленінград.

Патрэбна ліквідаваць адставаньне ў разгортваньні бульбазагатовак, пакончыць з апартуністычнай бязьдзейнасьцю райзагу. Белплодагародніне неабходна зьнішчыць канкурэнцкае захопніцтва, увесьці плянавасьць у загатоўкі.

Да ХУ-й гадавіны Кастрычніка рэвалюцыі поўнасьцю выканаць пляны адгрузкі бульбы пралетарскім цэнтрам.

Мікола Шванкоў.

Магілеў--у тыле бульбазагатовак

Магілеў. (Наш кар.). Ня гледзячы на спрыяючае надвор'е, што давала вялікія магчымасьці для пасьпяховага правядзеньня адгрузкі бульбы пралетарскім цэнтрам, адгрузка бульбы па раёне праходзіць яўна нездавальняючы. Да апошніх дзён гэта справа была пушчана на самацёк. Ні райза, ні Райснаб, ні Белплодагародніна амаль ніякіх захадаў ня прымалі да таго, каб увязаць цесна адгрузку бульбы з яе капаньнем.

Яны абмежаваліся толькі тым, што разаслалі пляны па сельсаветах і чакалі, што астатнюю работу правядуць сельсаветы. Гэта апартуністычная стаўка на самацёк загатоўчых арганізацый давяла да таго, што на 6 кастрычніка плян адгрузкі выкананы ўсяго каля 25 проц.; патрэбна было адгрузіць 2650 тон, адгружана—574 тоны. Па лініі райспажыўсаюза з належачых 2.000 тон—адгружана толькі 352 тоны. Па лініі Белплодагароднінны патрэбна было адгрузіць 650 тон—адгружана 222 тоны.

Існуюць яўна злачынныя факты ў справе затрымкі адгрузкі. Загатоўца па Вендраўскім сельсавеце нібыта па чуў, што ня будзе вагонаў і загадаў усім сялянам ня весьці бульбы да асобага распараджэньня. Сельсавет, бязумоўна, ведаў, аб гэтых фактах, але ніякіх захадаў да гэтага не прымаў. Значна затрымліваецца адгрузка з-за адсутнасьці вагонаў і несвячасовай іх падачы.

Так, напрыклад, гэтымі днямі на станцыі Вендараж праляжала 2 дні 200 цнт. бульбы з-за адсутнасьці вагонаў.

Мясцовыя арганізацыі таксама недаацэньваюць справу своячасовай адгрузкі бульбы пралетарскім цэнтрам.

Большасьць партячэек, сельсаветаў ня выканалі пастановы бюро РК КП(б)Б аб арганізацыі на 5-га кастрычніка чырвонага раённага абозу, які праводзіўся па ініцыятыве камсамольскай арганізацыі. У гэты дзень павінен быў быць адпраўлены камсамольскі эшалён з бульбай. Але замест шырокага ўдзелу грамадзкасьці ў абозе толькі адзінкі сельсаветаў прымалі ў ім удзел. Такім чынам раённы абоз быў сарваны. Зрыў яго тлумачыцца тым, што на мясцох ня было масавай работы, не растлумачана калгасьнікам, беднякам і сераднякам важнасьць своячасовай адгрузкі бульбы пралетарскім цэнтрам.

Некаторыя раённыя кіраўнікі адмаўляюцца ад гэтага кажучы, што «пляны даведзены да калгасаў і вёсак, няхай яны і грузяць, а нам трэба займацца другімі справамі». Такія настроі былі з боку паасобных старшынь сельсаветаў.

Раён меў поўную магчымасьць скончыць адгрузку бульбы. Аб гэтым сьведчыць рад посьпехаў перадавых калгасаў. Гэтыя калгасы, цесна спалучыўшы ўборку бульбы з адгрузкай, здолелі мабілізаваць калгасьнікаў на выкананьне і перавыкананьне пляну адгрузкі. Калгас «Першае мая», Бракаўскага сельсавету, адгрузіў 115 цнт. бульбы, калгас імя Карла Маркса—500 цнт і г. д.

Па прыкладзе перадавых калгасаў адстаючыя калгасы раёну павінны цалкам скончыць адгрузку бульбы і гэтым самым выканаць баявое заданьне партыі і ўраду.

Аў. Нёманскі.
Д. Алан.

Транспарт

Крывая адгрузкі падае ўніз

Па чыгуначнай сетцы БССР пагружана бульбы і плодагароднін (у вагонах)

11 кастрычніка	12 кастрычніка	13 кастрычніка
190	131	140

Пагрузка бульбы і плодагароднінны за 11, 12 і 13 кастрычніка сыгналізуе аб найвялікшым і глыбокім прарыве на транспарце ў гэтай галіне. Калі ў паасобныя дні дзённае выкананьне праграмы на перавозку бульбы даходзіла амаль да 400 вагонаў, дык за апошнія дні транспарт ня грузіць нават і 200 вагонаў. У бліжэйшыя-ж дні транспарт павінен асвоіць пагрузку блізка да 600 вагонаў штодзённа.

За гэтыя тры дні амаль ні адзін вузел ня выканаў свой перавозачны плян. Жлобінскі раён, які ў ранейшыя дні ішоў першым, таксама здаў тэмпы. 11 кастрычніка на станцыях раёну напружана 48 вагонаў (патрэбна было 77), 12 кастрычніка—42 вагоны (патрэбна 59) і 13—38 вагонаў (патрэбна 50). Асабліва дрэнна працавала станцыя Слуцак, на якой 11 кастрычніка сарвана пагрузка 23 вагонаў.

Гомельскі, Віцебскі, Аршанскі і Унецкі раёны працавалі ня лепш. Амаль на кожным раёне недагрузка даходзіць больш як за 10 вагонаў.

Асноўная прычына недагрузкі ў тым, што станцыі не забясьпечаны патрэбнай колькасьцю грузаў для бесьперабойнай пагрузкі. Мясцовыя аддзяленьні Белплодагароднінны, канторы ленінградзкага ЛСТС (асабліва Аршанская) і Гомельскі райсаюз зрываюць бесьперабойную дастаўку грузаў на чыгуначныя станцыі.

Апрача гэтага, яшчэ і да сенешняга, дню, наглядаецца агіднейшае забясьпечаньне вагонамі Унецкага раёну, які ня вылазіць з прарыву, дрэнная работа станцыі па падачы і пагрузцы паражняку.

Вынікі работы транспарту за апошнія дні, якія ні ў якім разе нельга лічыць цярпімымі, сыгналізуюць аб яўным паслаблёньні тэмпаў і ўвагі да пытаньняў адгрузкі бульбы. Бліжэйшыя дні павінны зьявіцца днямі рашучага пералому. Транспарт, які павінен асвоіць вялізарны грузапаток бульбы і плодагароднінны ў бліжэйшыя дні, адначасова з гэтым павінен пакрыць сваю запазычанасьць па перавозках, створаную ў мінулыя дні

Аб выніках верасьнёўскага пленуму ЦК і задачах Маскоўскай арганізацыі

З дакладу тав. КАГАНОВІЧА на пленуме МК і МГК сумесна з сакратарамі райкомаў вобласьці і актывам Маскоўскай арганізацыі УсеКП(б)

8 кастрычніка 1932 г.

Таварышы, верасьнёўскі пленум Цэнтральнага Камітэту нашай партыі аб меркаваў, як вы ўжо ведаеце з апублікаваных рэзалюцый, тры пытаньні: аб разьвіцьці савецкага гандлю, аб вырабе тавараў шырокага спажываньня і аб разьвіцьці чорнай мэталюргіі. Па ўсіх гэтых пытаньнях пленум заслухаў справаздачныя даклады адпаведных наркаматаў (НКСнабу, Наркамлёгпраму, Наркамцяжпраму) і арганізацый (Цэнтрасаюзу і ўсекааппрамсавету), а таксама судаклады РСІ.

Гэта ўказвае, на тое, што абмеркаваньне такіх надзвычайных пытаньняў, як работа чорнай мэталюргіі, як савецкі гандаль, выраб прадметаў шырокага спажыву і паляпшэньне пры дапамозе гэтага гандлю і вырабу шырспажыву снабжэньня працоўных гораду і вёскі, а таксама далейшае ўмацаваньне змычкі рабочай клясы з працоўным сялянствам, вялося з пункту гледжаньня канкрэтнай праверкі выкаланьня тых пастаноў і дырэктыў, якія прымаліся нашай партыяй і яе Цэнтральным Камітэтам, праверкі таго, як на справе ажыцьцяўляецца генэральная лінія нашай партыі. Мы ўступілі ў такую паласу, калі барацьба за генэральную лінію партыі і праверка яе ажыцьцяўленьня праводзяцца ня столькі ў агульных рэзалюцыях і па агульных і ўсё абымаючых пытаньнях, колькі ў практычнай штодзённай рабоце на асобных канкрэтных вучастках сацыялістычнага будаўніцтва. Тым больш гэта адносіцца да пытаньняў, якія стаяць на даным пленуме, бо яны маюць самую непасрэдную сувязь з нашай барацьбой па ажыцьцяўленьні генэральнай лініі партыі. У тых пытаньнях, якія стаялі на пленуме, і ў прынятых пленумам пастановах знайшла найбольш яркае адлюстраваньне лінія нашай партыі і яе ЦК, уся наша палітыка. Пастановы па пытаньнях чорнай мэталюргіі, па шырспажыве і савецкім гандлі, уяўляюць адзінае цэлае, ўяўляюць сабой тую суму задач, на якіх сканцэнтраваў сваю ўвагу Цэнтральны Камітэт партыі, па вырашэньні якіх ён мабілізуе ўсе сілы, ўсю волю і энэргію партыі, беспартыйных рабочых мас і калгасьнікаў.

Дабіўшыся ў барацьбе з трацкізмам і правым ухілам рашаючых посьпехаў у справе калектывізацыі і ўмацаваўшы тым самым у вялізарнай меры саюз рабочай клясы і працоўнага сялянства, на аснове вытворчых форм змычкі, мы атрымалі цяпер магчымасьць яшчэ больш умацаваць гэты саюз на аснове разгортваньня савецкага калгаснага гандлю. Дабіўшыся буйнейшых посьпехаў у справе разьвіцьця цяжкой індустрыі, мы атрымалі магчымасьць, разьвіваючы і надалей хуткімі тэмпамі цяжкую індустрыю і ў асаблівасьці чорную мэталюргію, максымальна разгортваць лёгкую індустрыю і павялічваць выраб прадметаў шырокага спажываньня. Разгортваньне савецкага гандлю, павялічэньне тавараабароту мы вядзем на аснове рашучай барацьбы супроць прыватніка, нэпмана, спэкулянта. Іменна таму, што мы адхілілі лінію, якую прабавалі нам навязаць трацкісты і правыя апартуністы, лінію аднаўленьня капіталізму, іменна таму, што мы дабіліся рашаючых посьпехаў у галіне індустрыялізацыі і калектывізацыі краіны, падвялі моцную базу цяжкай індустрыі, базу мэталюргіі, машынабудаўніцтва, электрычнасьці, хэміі і г. д. пад нашу гаспадарку, іменна таму, што мы дабіліся рашаючых посьпехаў у сваім разгорнутым сацыялістычным наступленьні на кулака, нэпмана, спэкулянта, — мы атрымалі магчымасьць ставіць ва ўсю велічыню і практычна вырашыць такія задачы, як разьвіцьцё лёгкай індустрыі, выраб шырспажыву, разгортваньне савецкага гандлю і ўмацаваньне гандлёвых форм змычкі гораду з вёскай. Пастановы пленуму ЦК мабілізуюць партыю, рабочую клясу і калгасьнікаў на вырашэньне новых практычных задач у барацьбе за генэральную лінію партыю, за пераможнае сканчэньне першай пяцігодкі. Пастановы пленуму ўліваюць новыя сілы, бадзёрасьць і энэргію ў мільённыя масы і заклікаюць іх, адкідваючы прэч усіх ныцікаў, усіх апартуністаў, згуртавацца яшчэ цясьней вакол ленінскага ЦК нашай партыі для далейшага перамаганьня труднасьцяй і барацьбы за сацыялізм. (Бурныя аплёдысмэнты).

Аб вырабе шырспажыву, рабоце прамысловасьці і прамкааперацыі

Тав. Сталін на XVI зьезьдзе партыі ўказаў, што «новае ў разьвіцьці нашай прамысловасьці заключаецца, між іншым, у тым, што мы маем цяпер магчымасьць разьвіваць паскораным тэмпам і цяжкую і лёгкую індустрыю».

За апошнія гады мы маем вядомы зрух і ў разьвіцьці лёгкай прамысловасьці. На базе вялізарнага росту цяжкай прамысловасьці, рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і росту тэхнічных культур мы стварылі магчымасьць хуткага разгортваньня таксама і лёгкай прамысловасьці як у адносінах павялічэньня аб'ёму яе прадукцыі (рост у 1931 г. у параўнаньні з 1928 годам на 71 проц.), так і рэканструкцыі яе тэхнічнай базы. Асабліва ўзрасьлі: швэйная прамысловасьць—на 276проц., трыкатажная — на 140 проц., абутковая — на 266 проц., і скурная—на 134 проц. у 1931 г. у адносінах да 1928 г. Але мы маем яшчэ больш гіганцкі рост патрэб краіны, рост патрэб рабочых і калгасьнікаў. У той-жа час рост цяжкай індустрыі выклікаў вялізарны рост, праўда, часта перапавялічаны, попыту прадметаў лёгкай індустрыі для прамысловага спажываньня.

Тав. Сталін на XVI зьезьдзе партыі ўказаў, што «новае ў разьвіцьці нашай прамысловасьці заключаецца, між іншым, у тым, што мы маем цяпер магчымасьць разьвіваць паскораным тэмпам і цяжкую і лёгкую індустрыю».

За апошнія гады мы маем вядомы зрух і ў разьвіцьці лёгкай прамысловасьці. На базе вялізарнага росту цяжкай прамысловасьці, рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і росту тэхнічных культур мы стварылі магчымасьць хуткага разгортваньня таксама і лёгкай прамысловасьці як у адносінах павялічэньня аб'ёму яе прадукцыі (рост у 1931 г. у параўнаньні з 1928 годам на 71 проц.), так і рэканструкцыі яе тэхнічнай базы. Асабліва ўзрасьлі: швэйная прамысловасьць—на 276проц., трыкатажная — на 140 проц., абутковая — на 266 проц., і скурная—на 134 проц. у 1931 г. у адносінах да 1928 г. Але мы маем яшчэ больш гіганцкі рост патрэб краіны, рост патрэб рабочых і калгасьнікаў. У той-жа час рост цяжкай індустрыі выклікаў вялізарны рост, праўда, часта перапавялічаны, попыту прадметаў лёгкай індустрыі для прамысловага спажываньня.

Пры агульным росьце таварнай прадукцыі ў 1931 г. у параўнаньні з 1930 годам на 11 проц., рыначны фонд павялічыўся на 5 з пал. проц., а нярынкавае спажываньне на 27 проц. Таму ЦК, распрацоўваючы праграму павялічэньня шырспажыву, у першую чаргу паставіў з усёй вострасьцю пытаньне аб скарачэньні пазарыначнага спажываньня.

У некаторых галінах прамысловасьці, напрыклад у гумавой, часта не разьлічвалі, колькі ўходзіць трыкатажу і мануфактуры для падкладкі ў галёшы, ня лічыліся, што калі выразаць больш удала, то з гэтага-ж кавалку можа выйсьці больш. Возьміце «Каўчук», «Красный богатырь» і ўбачыце, якая колькасьць абрэзкаў мануфактуры валяецца там.

Тав. Кагановіч прыводзіць падрабязныя лічбы скарачэньня нярынкавага спажываньня на 1932 год і павялічэньня рыначных фондаў.

На 12 плянуемых таварах (бавоўняна - папяровыя тканіны, шарсьняныя тканіны, ніткі, хусткі, трыкатаж, швэйныя вырабы, скураны абутак, галёшы, папяросы, махорка, мыла гас падарчае, мыла туалетнае) адгрузкі рынку (горад і вёска) за 9 месяцаў 1932 году павялічыліся на 18 проц. больш адпаведнага пэрыяду мінулага году.

ЦК даў строгую дырэктыву—у першую чаргу адгружаць тавары шырспажыву рынку, і ў асаблівасьці ў вёску. На працягу апошняга паўгодзьдзя і асабліва на працягу апошняга кварталу мы далі больш тавараў вёсцы і, калі можна так сказаць, «пакрыўдзілі» гарады. Мы на гэта пайшлі зусім сьвядома, бо для сапраўднага разьвіцьця калгаснага гандлю неабходна, каб калгасьніку даць прамысловыя тавары.

У вырабе прадметаў шырокага спажываньня мы ў першую чаргу сутыкаемся з сырцовай базай. Возьмем пытаньне аб бавоўне. У Расію да рэвалюцыі ўвозілася з-за мяжы бавоўны да 200 тыс. тон у год. На імпарт бавоўны трацілі валюту і мы. Партыя паставіла ўпартую барацьбу за стварэньне бавоўнянай базы, і ў сучасны момант мы ўласную бавоўняную базу стварылі.

У гэтым годзе мы павінны атрымаць і атрымаем, трэба спадзявацца, 27-28 млн. пудоў сваёй бавоўны, не затрачваючы на ўвоз яе з-за мяжы золата.

Спасыланьні гаспадарнікаў лёгкай індустрыі на адсутнасьць сырцу ў IV квартале ня вытрымліваюць ніякай крытыкі.

Гутаркі і спасыланьні на недахоп сырцу тым больш нягрунтоўныя для галін прамысловасьці, працуючых на такім сырцу, як дрэва (мабліравая, лыжкарная і інш. галіны дрэвааапрацоўчай прамысловасьці), гліна (ганчарная, фарфаранасавая і інш. вытворчасьці) і, нарэшце, уціль. Мы маем рад галін прамысловасьці, якія працуюць у значнай частцы на ўцільсырцу. Многіх з іх, напэўна, зьдзівіць, калі я скажу, што шарсьцяная прамысловасьць можа працаваць на 50 проц. на ўцільсырцу, папяровая прамысловасьць—на 25 проц. на ўцілі. Ватная і катанінная прамысловасьць—22-25 проц. уцілю, гумавая прамысловасьць—на 35 проц. уцілю, толевая—на 80 проц., галянтарэйная ў пераважнай частцы—на ўціле.

Наша задача заключаецца ў тым, каб мы ў барацьбе за шырспажыў разгарнулі ўсю творчую ініцыятыву мас і накіроўвалі яе ня толькі на вялікія справы, але і на так званыя «малыя справы», якія набываюць вялікае значэньне. Той, хто не разумее, што зараз важнейшая палітычная задача—вырабіць больш целагрэек, больш галёш, каб даць рабочым і сялянам, вырабіць зараз больш паперы, абутку і іншых тавараў, той, хто не разумее, што для гэтай работы неабходна засучыць рукавы, не баяцца бруднай работы, не баяцца дробязяй, не абмяжоўвацца агульнымі рэзалюцыямі, хто ня хоча займацца такімі канкрэтнымі справамі, той не бальшавік, ня ленінец, той не праводзіць генэральнай лініі партыі, колькі-бы ён ні даказваў адданасьць ёй на словах.

Мы павінны зараз, у прыватнасьці, па Маскве, паставіць перад сабой задачу: на зіму даць рабочаму цёплую вопратку. Калі ў яго ёсьць цёплая вопратка, але якую трэба адрамантаваць, яе яму трэба адрамантаваць, трэба даць дзецям цёплую вопратку, абутак. Колькі ў нас прападае старых валёнак? Колькі ў нас прападае ўсякай грубай шэрсьці па гарадох і вёсках?

Старую шэрсьць можна выкарыстаць, калі мы, напрыклад, для Масквы заключым сваячасова дагавары з саматужнікамі Сямёнаўскага раёну, Горкаўскага краю (ды і ў нас у Маскоўскай вобласьці ёсьць такія саматужнікі) і дамо масе рабочых, работніц дадаткова некалькі соцень тысяч пар цёплага абутку на зіму. Няўжо гэта ня будзе сапраўднай, патрэбнай справай.

Таварышы вобласьнікі,—а тут прысутнічаюць усе сакратары райкомаў Маскоўскай вобласьці,—я зварачаю вашу ўвагу на тое, што Маскоўская вобласьць займае выключна вялікае месца па саматужнай прамысловасьці. Да вайны сельскія саматужнікі на тэрыторыі Маскоўскай вобласьці выпускалі прадукцыі да 400 млн. руб. у год, а зараз 35-40 проц. даваеннага. Многія неяк лічаць няістотным саматужны промысел, тады як ён дае на сотні мільёнаў руб. шырспажыву рынку, а для калгасаў дадатковую прадукцыю і даход. Вось чаму на гэту справу трэба зьвярнуць выключную ўвагу, усямерна разьвіваць саматужныя арцелі ў Маскоўскай вобласьці.

Адна Маскоўская вобласьць па радзе галін можа ў бліжэйшым годзе падвоіць колькасьць прадметаў шырспажыву, якія выпускаюцца ў даны момант нашай саматужнай кааперацыяй. Гэта—наша баявая задача, якую мы павінны вырашыць.

Мы па ўсёй краіне павінны зараз разгарнуць максымальную ініцыятыву кожнага рабочага, кожнага калгасьніка саматужнай арцелі, заахвочваць ініцыятыву, ліквідаваць ганарлівасьць, бюракратычную пагардлівасьць да пытаньняў вытворчасьці, быту і абслугоўваньня саматужнікаў. Трэба ўсямерна падтрымаць саматужніка ня толькі тым, што мы яму заплацім за прадукцыю, а вы ведаеце з пастановы ЦК, што яму дазволена прадаваць сваю прадукцыю па больш дарагой цане,—але і штодзённай увагай і дапамогай, якія адыгрываюць вельмі вялікую ролю.

Чаму, напрыклад, на старонках друку не асьвятляецца работа саматужных арцеляй—лепшых, горшых? Чаму ўдарнікі саматужнай прамысловасьці не адзначаюцца ў газэце? Гэта павінна адыграць вялікую ролю ў стымуляваньні работы саматужнікаў і іх арцеляй.

Нездавальняючасьць работы ў галіне вырабу шырспажыву, падкрэсьленая пленумам, адносіцца, зразумела, і да Маскоўскай вобласьці. Па Маскоўскай вобласьці лёгкая прамысловасьць выканала плян за 8 месяцаў на 88 проц., а па аднэй Маскве за 9 месяцаў—на 91,7 проц. Мы маем поўную магчымасьць у IV квартале, як мы гэта зрабілі ў мінулым годзе, ня толькі выканаць квартальны плян, але і навярстаць упушчанае і выканаць хоцьбы частку пляну, нявыкананага за папярэднія тры кварталы.

Мы патрабуем, каб усе кіраўнікі, гаспэдарнікі і рабочыя лёгкай індустрыі Маскоўскай вобласьці ў IV квартале паказалі ўзоры барацьбы за выкананьне пастаноў ЦК па вырабу прадметаў шырокага спажываньня і ў асаблівасьці па тэкстылю. Маскоўская-ж вобласьць дае больш паловы прадукцыі СССР па бавоўняна-папяровых тканінах (54 проц.), трыкатажы (55 проц.), шэрсьці (60 проц.), 3/4 прадукцыі па шоўку, значную частку швэйных вырабаў, абутку, галянтарэі. Адначасова, каб забясьпечыць выкананьне прамфінпляну па шырспажыве, мы павінны ўзмацніць увагу да абслугоўваньня патрэб лёгкай прамысловасьці і ў асаблівасьці да пытаньняў рабочага быту.

У пастановах пленуму Цэнтральнага Камітэту партыі шмат увагі аддаецца тэкстыльнай прамысловасьці. Павышаецца зарплата тэкстыльшчыкам у сярэднім на 15,9 проц. Мы павінны асабліва ў тэкстыльнай прамысловасьці выключную ўвагу аддаць клопатам аб рабочых (паляпшэньне сталовых і г. д.)

Пры выкананьні прамфінпляну па шырспажыве, у асаблівасьці па тэкстыльнай прамысловасьці, мы павінны ўнікаць тых памылак, якія былі дапушчаны ў апошнія гады. Я маю на ўвазе так званую функцыяналку.

У мінулым годзе прышлі да нас гаспадарнікі і паставілі пытаньне аб увядзеньні функцыяналкі, г. зн. аб падзеле прафэсіі ткача, прадзільшчыка па асобных апэрацыях. Калі раней ля ткацкага варштату стаяла адна ткачыха, то пры функцыяналцы ўвялі такія спэцыяльнасьці: заводчыца, аснэўшчыца, пускальшчыца, адрыўшчыца зарадчыца. Што ад гэтага атрымалася? Ад гэтага атрымалася, па-першае, паўнейшая дыскваліфікацыя рабочых, ліквідавалі ткача, ліквідавалі прадзільшчыка, многіх спэцыялістаў высокіх замянілі некваліфікаваныя рабочыя, якія справіцца з варштатам ня могуць, якія бегаюць ад аднаго варштату да другога.

Пры адсутнасьці інструктажу, без падрыхтоўкі, без сапраўдных наладчыкаў і кіраўнікоў увядзеньне гэтай функцыяналкі азначала прыкладна такую-ж памылку, як у свой час абязьлічка паравозаў.

Мы ў Маскоўскім камітэце партыі рашуча супраціўляліся ўвядзеньню функцыяналкі, выказаліся супроць дадзенага ўвядзеньня функцыяналкі. Хаця ў нас асноўную масу ткацкіх цэхаў функцыяналка не ахапіла але ўсё-ж частка была пераведзена, і ў звататніх ткачоў ня было ніякай упэўненасьці, што ў бліжэйшы-жа час іх не перавядуць на функцыяналку. У рэзультаце гэта функцыяналка дэзарыентавала кадры тэкстыльнай прамысловасьці. Пленум Цэнтральнага Камітэту вынес пастанову: скасаваць фукцыяналку ў тэкстыльнай прамысловасьці. Я пераконан, што тэкстыльшчыкі гэта ўхваляць, за выключэньнем заядлых «функцыяналаў». (Сьмех).

Зьнішчыць недахопы, арганізаваць новыя перамогі ў чорнай мэталюргіі

Даўшы падрабязны аналіз сацыяльна-эканамічных зрухаў у нашай краіне ў сувязі з посьпехамі і перамогамі пяцігодкі, ілюструючы лічбамі пасьпяховае выкананьне пяцігодкі па буйнейшых галінах гаспадаркі (машынабудаўніцтва, нафта, электратэхніка, швэйная і г. д.), тав. Кагановіч асабліва падкрэсьліў, што адстаючымі ў выкананьні праграмы гэтага году галінамі аказаліся чорная мэталюргія і рад галін лёгкай індустрыі.

Іменна таму невыпадкова, што пленум ЦК сканцэнтраваў увагу ўсёй партыі і рабочай клясы на пытаньнях чорнай мэталюргіі і вырабу прадметаў шырокага спажываньня. Гэтыя пытаньні разам з пытаньнем аб далейшым разгортваньні савецкага гандлю ўяўляюць сабой у сучасны момант тыя зьвеньні, за якія неабходна ўхапіцца для таго, каб дабіцца далейшага ўздыму матар'яльнага дабрабыту працоўных гораду і вёскі і далейшага ўмацаваньня змычкі рабочай клясы з сялянствам.

Ня гледзячы на тое, што чорная мэталюргія належыць да галін, адстаючых у выкананьні праграмы гэтага году, мы маем у гэтай галіне буйнейшыя дасягненьні, якія мы ні ў якім выпадку ня можам недаацэньваць. Тэмпы і размах, якімі ідзе разьвіцьцё нашай чорнай мэталюргіі, зьяўляюцца нябывалымі і нямыслімымі для капіталістычных краін. Гэтыя посьпехі нашай чорнай мэталюргіі выгляядаюць асабліва вялікімі на фоне таго развалу, які мы наглядаем у чорнай мэталюргіі, як і ва ўсіх галінах гаспадаркі капіталістычных краін у сувязі з крызісам. У той час, як усе капіталістычныя краіны вымушаны гасіць домну за домнай і рэзка скарачаць выплаўку чыгуну і сталі, мы ўводзім у строй усё новыя і новыя домны і рэзка павялічваем выплаўку. Даволі сказаць, што за адзін толькі пэрыяд пасьля XVI зьезду партыі мы перабудавалі 8 доменных печаў, пусьцілі 12 новых доменных печаў, прычым у адным толькі 1932 годзе мы пусьцілі 9 печаў. У бліжэйшыя дні ў строй увойдуць яшчэ 2 новыя доменныя печы. З 20 пушчаных за апошні час новых мартэнаў 13 прыходзіцца на 1932 год. Апрача таго, у будоўлі знаходзіцца 16 домнаў і 50 мартэнаў. Што датычыць выплаўкі, то па чыгуну яна складала за 9 месяцаў 4½ млн. тон, па сталі—4,1 млн. тон, а па пракаце — 3½ млн. тон. Павялічыўся ў нас выраб якасных сталяй.

Аднак усе гэтыя нашы дасягненьні ў чорнай мэталюргіі ні ў якім выпадку не павінны закрываць ад нас тых вельмі істотных недахопаў, якія мы маем як у частцы будаўніцтва і ўводу ў эксплёатацыю новых домнаў, мартэнаў і пракатных варштатаў так і асабліва ў частцы выкананьня прадпрыемствамі чорнай мэталюргіі пляну выплаўкі і пракату. Пры гэтым мы павінны выходзіць з гіганцкіх ўзросшых патрэб нашай народнай гаспадаркі ў мэталі і з тых магчымасьцяй, якія мы маем для значнага павялічэньня выпуску мэталю, але якія мы ў далёка невыстарчальнай меры выкарыстоўваем. Буйнейшы попыт на мэталь прад'яўляе ў першую чаргу наша надзвычай узросшае машынабудаўніцтва, запатрабаваньні якога мы, на жаль, задавальняем у вельмі нязначнай ступені. Тут мы маем сур'ёзьнейшую дыспрапорцыю паміж ростам машынабудаўніцтва і задавальненьнем яго мэталем. Так, напрыклад, калі машынабудаўніцтва ў нас вырасла ў адносінах да 1928 г. у 4 разы, то выплаўка сталі ў нас вырасла ўсяго на 36 проц. Адсюль ясна, якое значэньне для нас набывае работа чорнай мэталюргіі, выяўленьне і зьнішчэньне тых недахопаў, якія мы маем у справе арганізацыі і кіраўніцтва работай прадпрыемстваў чорнай мэталюргіі. А недахопаў гэтых, як гэта паказалі даклады на пленуме, на жаль, вельмі многа. Гэта адносіцца і да Маскоўскай вобласьці, дзе мы маем такія прадпрыемствы, як Тульскі мэталюргічны завод, завод «Серп і Молат» у Маскве, «Электрасталь», а таксама будаўніцтва новага мэталюргічнага заводу ў Туле, работу якіх мы павінны былі-б зрабіць узорнай. Значнае адставаньне мэталюргічных прадпрыемстваў у выкананьні пляну адносіцца таксама і да нашых прадпрыемстваў, дзе плян за 8 месяцаў выканан усяго толькі на 80 проц., хаця прадукцыя гэтых заводаў дала прырост у адносінах да мінулага году на 24,5 проц. І мы, масквічы, павінны дабіцца хутчэйшага выпраўленьня недахопаў у нашай чорнай мэталюргіі, а таксама асабліва ў рабоце Падмаскоўнага басэйну.

У сваёй рэзалюцыі пленум ЦК падкрэсьліў, што галоўнейшай з усіх існуючых прычын зусім нездавальняючай работы чорнай мэталюргіі зьяўляецца імена нездавальняючае гаспадарчае і адміністрацыйна-тэхнічнае кіраўніцтва яе работай, а таксама слабая ўвага да вывучэньня і аўладаньня тэхнікай у вытворчасьці, нізкая працдысцыпліна і слабая ўвага да штодзённых бытавых патрэб рабочых.

Прыводзячы рад прыкладаў з жыцьця і работы прадпрыемстваў, тав. Кагановіч гаворыць:

— На гэтых прыкладах мы бачым, як глыбока меў рацыю ў сваіх выступленьнях тав. Сталін, падкрэсьліваючы вялізарнае значэньне ў сучасны момант вывучэньня тэхнікі, правільнага і канкрэтнага кіраўніцтва для поўнага выкананьня нашай прамысловасьцю, асабліва чорнай мэталюргіяй, намечаных для яе плянаў.

У ліку прычын нездавальняючай работы чорнай мэталюргіі буйнейшае месца займае слабая работа па падрыхтоўцы кадраў, пачынаючы ад рабочых, майстраў і тэхнікаў, і канчаючы інжынэрамі і кіраўнікамі цэхаў і прадпрыемстваў. Гэта пытаньне вострае ня толькі для чорнай мэталюргіі. Мы маем на нашых прадпрыемствах вялікую колькасьць новых рабочых і маладых майстраў, тэхнікаў, інжынэраў. Даволі напрыклад сказаць, што ў электратэхнічнай прамысловасьці мы маем павялічэньне ліку рабочых з 45 тыс. у 1930 г. да 130 тыс. рабочых у 1932 г. у машынабудаўніцтве — з 455 тыс. рабочых да 947 тыс. у 1932 г. Аўладаньне новай, укараненай у нашу гаспадарку тэхнікай, асваеньне новых варштатаў і машын зьяўляецца вельмі цяжкай і важнай задачай.

Слабае вывучэньне працуючых людзей на прадпрыемстве і няправільная іх расстаноўка побач са слабай партыйна - масавай і прафэсыянальнай работай на прадпрыемствах і зьяўляецца большай часткай прычынай таго, што на прадпрыемствах ёсьць лішак рабочай сілы, што прадукцыйнасьць працы не павышаецца, сабекошт ня зьніжаецца, і ў рэзультаце—невыкананьне пляну.

Улічваючы ўсё гэта, Цэнтральны Камітэт у радзе сваіх апошніх пастаноў з усёй рашучасьцю паставіў пытаньне аб неабходнасьці сыстэматычнай і ўпартай барацьбы за павышэньне кваліфікацыі і павялічэньне аб'ёму тэхнічных ведаў як у сярэдняга і вышэйшага інжынэрна - тэхнічнага пэрсаналу, так і ў саміх рабочых. З асаблівай сілай Цэнтральны камітэт падкрэсьліў гэта ў апублікаваных ня даўна пастановах аб вышэйшай школе і аб вугальнай прамысловасьці Данбасу.

Заканчваючы з гэтым пытаньнем, я-бы хацеў яшчэ раз падкрэсьліць тое значэньне, якое пленум ЦК надае пытаньням выразнага і апэрацыйнага кіраўніцтва, правільнай арганізацыі працы і вытворчасьці ў цэлым, аўладаньня тэхнікай і пытаньням умацаваньня працдысцыпліны і штодзённай увагі да бытавых патрэб рабочых. Гэтым самым пленум гаворыць рабочым, гаворыць інжынэрна-тэхнічнаму і кіруючаму гаспадарчаму складу чорнай мэталюргіі: мы маем усе магчымасьці, каб пасунуць далёка наперад разьвіцьцё нашай уласнай, намі самімі створанай, чорнай мэталюргіі, як гэтага патрабуюць ад нас інтарэсы народнай гаспадаркі і ўмацаваньня абароназдольнасьці нашай краіны. Ад нас, ад нашай работы, ад нашага ўменьня залежыць ператварэньне, як гаварыў т. Сталін, магчымасьцяй у сапраўднасьць. Мы можам і павінны арганізаваць новыя перамогі ў чорнай мэталюргіі

Пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК наперад, да новых перамог

Таварышы, як мы бачым, пастановы пленуму ЦК даюць разгорнутую, канкрэтную бальшавіцкую праграму дзеяньня для далейшага прасоўваньня наперад да пераможнага завяршэньня першай пяцігодкі і да барацьбы за другую пяцігодку. Тым самым пастановы пленуму ЦК наносяць жорсткі ўдар па капітулянтах і буржуазных перараджэнцах з лягеру контрэвалюцыйных працыстаў і правых апартуністаў, даюць адпор усім ныцікам і хлюпікам, мабілізуюць волю, энэргію і сілы бальшавіцкай, рабочых, калгасьнікаў на далейшую барацьбу на базе дасягнутых посьпехаў пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК. У гэтых адносінах пастановы верасьнёўскага пленуму ЦК цясьнейшым чынам зьвязаны з радам іншых пастаноў ЦК, вынесеных за апошні час. Я маю на ўвазе пастанову ЦВК і СНК ад 7 жніўня «аб ахове маемасьці дзяржаўных прадпрыемстваў, калгасаў, кааперацыі і ўмацаваньні грамадзкай (сацыялістычнай) уласнасьці», пастанову ЦВК і СНК СССР ад 3 верасьня «аб мерах разьвіцьця на павышаныя ўрадзайнасьці», пастанову ЦВК і СНК СССР ад 3 верасьня «аб захаваньні ўстойлівага землякарыстаньня калгасаў». Як ні прадракалі ворагі, нашы калгасы мацнеюць, наша вёска канчаткова ўмацавалася на калгасным шляху.

Пастановы аб ўрадзжайнасьці і аб землякарыстаньні калгасаў маюць тое буйнейшае значэньне, што яны, па-першае, замацоўваюць нашы дасягненьні ў галіне сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі. Па-другое, яны ўказваюць шляхі далейшага ўздыму, павялічэньня масы сельскагаспадарчай прадукцыі. Таму неабходна нам—работнікам Маскоўскай вобласьці—ўсяшчэ пільна за ажыцьцяўленьнем гэтых пастаноў, усямерна ўмацоўваць нашы калгасы і ўзьнімаць урадзжайнасьць нашай сельскай гаспадаркі. Гэта патрабуе ад нас дакладнага, канкрэтнага вывучэньня асаблівасьцяй нашай сельскай гаспадаркі, асаблівасьцяй кожнага калгасу і раёну, вывучаць апрацоўку і тэхніку сельска-гаспадарчай вытворчасьці. Не дарма ЦК, надаючы гэтай справе выключнае значэньне, вынес пастанову аб рэарганізацыі ўсіх камунаўдзу і вышэйшыя сельска-гаспадарчыя камуністычныя школы і паставіў перад імі задачу вывучаць ня толькі партыйнае і савецкае будаўніцтва ў вёсцы, але і агранамію, зоатэхніку, расьлінаводзтва і г. д. Побач з гэтым мы павінны ліквідаваць нашай сельскай гаспадаркі. Гэта патрабуе ад нас дакладнага, канкрэтнага вывучэньня асаблівасьцяй нашай сельскай гаспадаркі, асаблівасьцяй кожнага калгасу і раёну, вывучаць апрацоўку і тэхніку сельска-гаспадарчай вытворчасьці. Не дарма ЦК, надаючы гэтай справе выключнае значэньне, вынес пастанову аб рэарганізацыі ўсіх камунаўдзу і вышэйшыя сельска-гаспадарчыя камуністычныя школы і паставіў перад імі задачу вывучаць ня толькі партыйнае і савецкае будаўніцтва ў вёсцы, але і агранамію, зоатэхніку, расьлінаводзтва і г. д. Побач з гэтым мы павінны ліквідаваць нашай базы, ліквідаваць нашай базы, ліквідаваць нашай базы,

Працяг прамовы Л. М. Кагановіча

трудніцьцай ня можа абыйсьціся тая вялізарная перабудова нашай краіны, якую мы правялі па ператварэньні нашай адсталай, бездарожнай, некультурнай, паўдзікай краіны і асаблівa перабудова цёмнай, забітай вёскі, якая векамі прыгнечвалася,—у перадавую прамысловую і культурную краіну, у краіну саміга буйнага ў сьвеце землеробства, перабудова, якая праводзіцца ня кледзячы на шалёнае супраціўленьне зьнішчаемага клясавага ворага і яго шматлікай агентуры. Нічога ня варты той бальшавік, які не бачыць вялізарных зьмен, што адбыліся ў нашай краіне.

Даволі прывесьці толькі адно параўнаньне.

У 1921 годзе Ленін пісаў:

«Паглядзеце на карту РСФСР. На поўнач ад Волагды, на паўднёвы ўсход ад Растова-на-Доне і ад Саратава, на поўдзень ад Арэнбурга і ад Омску, на поўнач ад Омску ідуць неабсяжныя прасторы, на якіх зьмясьціліся-б дзесяткі вялізарных культурных дзяржаў. І на ўсіх гэтых прасторах панаваў патрыярхальшчына, паўдзікасьць і самая са праўдная дзікасьць. А ў сялянскіх закутках усёй астатняй Расіі? Усюды, дзе дзесяткі вёрст прасёлку—правільней, дзесяткі вёрст бездарожжа—аддзяляюць вёску ад чыгунак, г. зн. ад матар'яльнай сувязі з культурай, з капіталізмам, з буйнай прамысловасьцю, з вялікім горадам? Ныўко не пераважае ўсюды ў гэтых мясцох таксама патрыярхальшчына, абломаўшчына, паўдзікасьць?» (Ленін, т. XVIII, ч. I, стар. 204).

А зірніце вы цяпер—у 1932 годзе на карту Савецкага саюзу. Якія вялізарныя зьмены ўнесла пяцігодка. Сотні новых прамысловых прадпрыемстваў, дзесяткі новых гарадоў (Хібінагорск, Кандалакша, Ігарка, заводы паўночнага Ўралу—Берэзьнікі, Сасікамск, Магнітагорск-Караганда, Кузбас, Турксіб, Дняпрабуд і г. д. і г. д.).

А па дзесятках тысяч кілёмэтраў вясковага бездарожжа, дзе шчэ нядаўна панавалі дзікасьць, патрыярхальшчына, вырасьлі сотні і тысячы новых саўгасаў, калгасаў, МТС, школ, клюбаў, бібліятэк, 140 тыс. трактараў бараздзяць палі калгасаў і саўгасаў, дзесяткі тысяч аўтамабілаў свайго вырабу рушацца па новых тысячах кілёмэтрах новых шасэйных дарог.

І ў гэты час знаходзяцца людзі з контр-рэвалюцыйнага трацкісцкага і правароўхілісцкага лягеру, якія зараз—у 1932 годзе прапануюць нам ня больш ня менш, як адмаўленьне ад пабудаваньня ўпартай працай рабочае клясы і калгаснікаў заводы на канцэсіі капіталістам. Знаходзяцца людзі, якія прапануюць нам ня больш ня менш, як распусьціць калгасы і саўгасы і адмавіць кулака. Мы дабіліся радыкальных посьпехаў у барацьбе за якасную незалежнасьць нашай краіны, у барацьбе за яе індустрыялізацыю. А зараз знаходзяцца людзі, якія прапануюць нам узмацніць нашу залежнасьць ад капіталістычнага сьвету, бо з нашай барацьбы за эканамічную незалежнасьць, усё-роўна, нічога ня выйдзе. І ўсё гэта ня выдуманыя суб'екты, а канкрэтныя жывыя людзі, якія да апошніх дзён захоўвалі ў сябе партыйны білет. Я маю на ўвазе людзей, якія належалі раней да трацкісцкай, або праваапартуністычнай апазыцыі. Сярод крыхільнікаў гэтых былых апазыцый ёсьць дзьве катэгорыі людзей: адна з іх сумленна парвала са сваім мінулым і імкнецца шчыра весьці актыўную барацьбу за лінію нашай партыі. Другая катэгорыя вярнулася ў нашу партыю з тым, каб адсядзецца да «лепшых» часоў, прынесла камень за пазухай і вагрыстаецца малейшай магчымасьцю для таго, каб подла і здрадніцкі адна віць барацьбу супроць партыі, барацьбу набыўную яўна контр-рэвалюцыйны характар. Гэтыя паны прапаведуюць простую рэстаўрацыю капіталізму. Гэта мізэрная група, пратыўшыя асоблі трацкісцкай і правароўхілісцкай апазыцыі, з якой ня трэба ўступаць у спрэчкі, а проста выпхнуць вон з радоў нашай ленінскай партыі, выганіць тых, хто прымрэнцтвуе да гэтых ворагаў, укрывае іх і дапамагае ім.

А вялікая ленінская партыя пойдзе цьвёрда сваім баявым шляхам і яшчэ цясьней згуртуецца вакол свайго ЦК, вакол свайго стойкага правадыра, кіраўніка і настаўніка тав. Сталіна. (Бурныя воплескі)

Мы ні на хвіліну не забываем, што іменна, дзякуючы цьвёрдаму ленінскаму кіраўніцтву ЦК і тав. Сталіна, наша краіна гігантскі ўмацавала ня толькі сваю ўнутраную, але і міжнародную магутнасьць. На базе індустрыялізацыі мы ўмацавалі абароназдольнасьць нашай краіны і магутнасьць Чырвонай арміі—гэта дае нам магчымасьць весьці вытрыманую і вытрую пралетарскай дзяржавы міжнародную палітыку. Наш рабочы і калгасьнік цьвёрда ўпэўнены, што іх урад, выдучы палітыку міру, у выпадку патрэбы зможа пастаяць за сябе і адстаяць незалежнасьць нашай вялікай краіны ня толькі словам, але і справай і ня толькі за дыплёматычным сталом

Вось чаму наш рабочы і калгасьнік самаздана падтрымліваюць сапраўдную ўладу, нашу партыю і яе верную ленінскую палітыку.

Маскоўская арганізацыя бальшавікоў, даваўшая ня раз узоры непрымірымай барацьбы супроць скрытых і адкрытых ворагаў партыі і яе ЦК, зараз, як ніколі згуртавана вакол свайго ЦК і гатова біцца да канца за яго лінію, за яго пастановы, за поўную перамогу сацыялізму. (Бурныя апладысмэнты).

Голасам усіх маскоўскіх бальшавікоў мы гаворым: нехай жыве наш ленінскі ЦК!

Нехай жыве наш настаўнік і кіраўнік, наш правадыр тав. СТАЛІН! (Бурныя апладысмэнты).

Пераключыць МТС на барацьбу за зяблёва

Трактару і каню—поўную нагрузку

Аб ходзе сяўбы азімых і зяблівага ворыва па БССР

Зводка на 10 кастрычніка

	Сяўба азімых			Зяблівага ворыва		
	План	Засеяна	Пропант. выкан.	План	Узарана	Пропант выкан.
Саўгасы	40000	34724	86,8	1500 0	20334	13,6
Калгасы	600000	528130	88,0	800000	143260	17,9
У тым ліку МТС	220000	190299	86,4	30 000	65018	21,6
Аднаасобнікі	720000	639794	88,9	55 000	1573/8	28,6
Разам па БССР	1360000	1202648	88,4	1500000	32972	21,4
Было на 5-X 1932 г.	—	1183591	87,0	—	248551	16,6
Было на 10-X 1931 г.	—	1213708	89,9	—	317832	19,0

Аршанская МТС у барацьбе з вымачкай

Ворша. Аршанская МТС першай у БССР уступіла ў барацьбу з вымачкай і за асваеньне бросавых зямель шляхам мэліярацыі.

Работы па мэліярацыі вытвараюцца трактарамі пры дапамозе канавакапальніка сыстэмы «Паава». Канавакапальнік «Паава», калі яго цягнуць спарана два трактары ў адну вымену за 8-10 гадз. выкопвае канаву даўжынёй у 6 клм., глыбынёю ў 70 сям. і шырынёй ў 1 м. Адзін дзень работы канавакапальнікам замяняе 400 прабарскіх рабочых працадзён.

У калгасе «Чырвоны кут» Яромкаўскага сельсавету гэтая работа распачата. Ужо выкапана да 7 клм. канаў з агульным ахопам плошчы каля 150 га.

Работа канавакапальніка тэхнічна вытрымана і не патрабуе падчысткі.

Канавакапальнік «Паава» дасланы ў Воршу дасьледчым інстытутам у 1929 годзе для выпрабаваньня. Але тады ён не зняйшоў сабе прымяненьня з прычыны адсутнасьці мэханізаванай цягавай сілы. Зараз гэты канавакапальнік мае выключнае значэньне ў барацьбе з вымачкай. Пры дапамозе гэтага канавакапальніка МТС запэўнівае, што дадзены ёй гідратэхнічны плян у 500 га будзе выкананы і перавыкананы. Трактарацэнтр і Саўгастрэст павінны скарыстаць вопыт Аршанскай МТС, перанесьці яго на астатнія МТС БССР.

Белта.

Чаму не скарыстана мінэральнае ўгнаеньне?

Барацьба за ўздым ураджайнасьці зьяўляецца галоўнай задачай партыі, пастаўленай перад калгасна-зямельнымі арганізацыямі. Але гэта надзвычай на палітычай важнасьці задача некаторымі Стара-Дарожкімі арганізацыямі: Райкалгассаюзам, МТС і Райза—злосна ня выконваецца. Ня гледзячы на тое, што ўжо асеньняя сяўба падыходзіць да канца, у Старых Дарогах вакол чыгуначнага шляху яшчэ да гэтага часу ляжыць нескары станым 188 тон мінэральных угнаеньняў. Некаторыя калгасы раёну («Чырвоная зорка» і інш) пасеялі азімы клін на пустой зямлі. Але раённыя арганізацыі не паклапаціліся аб тым, каб калгасы былі забясьпечаны ўгнаеньнем.

Пра гэта агіднае зьявішча ведаюць у раёне ўсе, але нічога ня робяць. Та кім чынам 188 тон угнаеньня псуецца непакрытае пад дажджом патаптанае Шмат разоў на кучы ўгнаеньняў наты каюцца раённыя адказныя работнікі. Але ніякіх мер яны ня прымаюць. Трэба судовым органам умяшацца ў гэтую справу і вінаватых прыцягнуць да адказнасьці.

А. М.

Наладзіць работу трактарнага парку

Майстэрня для рамонту трактароў і прычэпных частак, якая знаходзіцца пры саўгасе «Уваравічы» працуе з рук вон дрэнна. Тут пануюць абязьлічка і нядбайныя адносіны да рамонту трактароў. У выніку такой работы трактары, толькі адрамантаваныя, хутка зноў патрабуюць рамонту. Парт'ячэйка аб гэтым ведае, але ніякіх мер ня прымае

Аб недапушчальна дрэнній рабоце трактарнай майстэрні сьведчаць наступныя факты. З калгасу «Энгельса» трактар прастаяў у майстэрні паўтара месяца, з саўгасу «Новы шлях» тры трактары прастаялі ў майстэрні ўсё лета і выйшлі з рамонту няспраўнымі, (яшчэ дагэтуль не працуюць). Трактар саўгасу «Старая Беліца» стаіць на рамонце больш 2-х месяцаў, у саўгасе «Будзённага» два трактары няспраўныя. Гэтыя факты сьведчаць аб тым, што ўваравіцкія партыйныя, савецкія і гаспадарчыя арганізацыі пакінулі на самацёк работу трактарнага парку, што трактару ў гэтым раёне не нададзена належная увага, што не вядзецца барацьба за павышэньне ўраджайнасьці. А зяблёвае ворыва, як і ў мінулым годзе—ў раёне зрываецца (на 10 кастрычніка плян выкананы толькі на 12,3 проц.).

Такому становішчу з трактарным паркам трэба пакласьці канец. Увесь трактарны парк трэба пераключыць на зяблёва.

Па баявому рэалізаваць пастанову СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб павышэньні ўраджайнасьці

А. Казіміраў

Забыліся на барацьбу за якасьць апрацоўкі глебы

КЛІМАВІЧЫ. Клімавіцкі раён, які ў шмат якіх галінах работы мае дасягненьні (перавыкананьне пляну мабілізацыі сролкаў, добрая пастаноўка культурна-бытавой работы і інш) за апошні час дапусьціў рад глыбокіх ірываў.

Асеньняя сяўба, тэрміны якой ужо даўно мінулі, яшчэ далёка ня скончана: на 25 верасьня плян выкананы на 9,1 проц. Пры гэтым нельга не адзначыць, што калгасны сэктар значна адстаў ад аднаасобнага і выканаў свой плян толькі на 88 проц. пры за севе аднаасобнікамі 99 проц.

Трэба адзначыць, што справа ўзьняцця ўраджайнасьці азімых пасеваў не пастаўлена ў цэнтры ўвагі, мясцовых арганізацый. Якасьць апрацоўкі глебы, ачыстка насеньня і іншыя агратэхнічныя мерапрыемствы ў радзе месц выпушчаны з-пад увагі

К. ВЕКБІН.

СЕНЬНЯ АДКРЫВАЕЦЦА III УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД т-ва „ПН"

Ажывіць работу ячэек „ПН", мабілізаваць грамадзкасьць на барацьбу за ўвядзеньне ўсенавучу малапісьменных, на ліквідацыю рэштак няпісьменнасьці да ХУ гадавіны Кастрычніка—задача зьезду т-ва „ПН"

За перабудову работы!

Увядзеньне ўсенавучу малапісьменных і ліквідацыя рэштак няпісьменнасьці зьяўляецца баявой задачай, якая пастаўлена сакавікоўскім пленумам ЦК і ЦКК КП(б)Б.

Поўны ахоп рэштак няпісьменных ліквпунктамі, поўны ахоп школамі ўсіх малапісьменных, забясьпечаньне належнай якасьці навучаньня, падрыхтоўкі масавых кадраў для прамысловасьці—з гэтым мы павінны прыйсьці да ХУ гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Партыйныя, камсамольскія прафсаюзныя арганізацыі, РВК, сельсаветы, ў першую чаргу органы Наркаўсьветы, гаспадарнікі павінны ўсяк мерна разгарнуць работу, каб дамагчыся лепшага выкананьня дырэктыў сакавікоўскага пленуму ЦК і ЦКК аб ліквідацыі малапісьменнасьці і рэштак няпісьменнасьці. Трэба рашуча змагацца з недаацэнкай усенавучу малапісьменных і ліквбезу.

Вялікую ролю ў вырашэньні гэтых задач павінны адыграць Т-ВА «ПН». Т-ва «ПН» мае значныя посьпехі ў сваёй рабоце. У мінулым навучальным годзе яно здолела ахапіць навучаньнем 130 тыс. чал Рад раённых і мясцовых арганізацый «ПН» ядуць немалую работу па мабілізацыі мас на разгортваньне сацыялістычнага будаўніцтва, на барацьбу з няпісьменнасьцю, на барацьбу за ўсенавуч малапісьменных. Так, у ЖЫТКАВІЦКІМ раёне сіламі т-ва «ПН» пазыка «4-га заваршаючага году ляцігодкі» рэалізавана на 13 тыс. руб. У ТАЛАЧЫНСКІМ раёне засеяна 12 культ. га, сродкі ад якіх пойдуць на ліквідацыю няпісьменнасьці і малапісьменнасьці. Рад раённых саветаў т-ва «ПН» (ЖЫТКАВІЦКІ, МАЗЫРСКІ, ТАЛАЧЫНСКІ, АСІПАВІЦКІ) здолелі разгарнуць работу па падрыхтоўцы да III ўсебеларускага зьезду «ПН», дамагліся значнай актывізацыі работы ячэек «ПН». Жыткавіцкая раённая канфэрэнцыя ўзяла на сябе абавязак навучыць у гэтым годзе 2 тыс. чал. У ТАЛАЧЫНСКІМ раёне арганізавана 13 новых ячэек «ПН».

Але-ж трэба сказаць, што большасьць раёнаў не разгарнулі як сьлед работы па падрыхтоўцы да III усебеларускага зьезду т-ва «ПН», не забясьпечылі ажыўленьня актыўнасьці ячэек «ПН». У радзе раёнаў (Горацкі, Чашніцкі) раённыя саветы т-ва «ПН» зусім бязьдзейнічаюць.

Каб цалкам выканаць узятыя на сябе абавязкі па ахопу навучальнем 220 тыс. чал., т-ва «ПН» павінна разгарнуць работу па ажыўленьні дзейнасьці сваіх ячэек, павінна рашучым чынам перабудаваць сваю работу пад кутом погляду лепшай рэалізацыі дырэктыў сакавікоўскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б, мабілізаваць райсаветы, ячэйкі і кожнага члена на лепшую падрыхтоўку да ХУ гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.

III усебеларускі зьезд т-ва «ПН» павінен забясьпечыць пералом у работе т-ва «ПН», узьняць яго работу на вышэйшую ступень па барацьбе за ператварэньне ўсіх працоўных у сьвядомых будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Узьняць работу Горацкага т-ва „ПН"

Горацкая арганізацыя таварыства «ПН» налічвае 601 членаў ,якія аб'яднаюцца ў 37 ячэйках.

На працягу апошніх 4-5 месяцаў райсавет т-ва «ПН» ніякай работы не праводзіў. Між тым, у раёне няпісьменных каля 200 чал., а малапісьменных—звыш 8 тысяч. Райсавет таварыства «ПН» не разгарнуў работу па ліквідацыі рэштак няпісьменнасьці, па ажыўленьні дырэктывы сакавікоўскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб абавязковай ліквідацыі малапісьменнасьці сярод рабочых і працоўных.

Работу Горацкага райсавету т-ва «ПН» трэба ўзьняць. На аснове сацспаборніцтва і ўдарніцтва трэба дамагчыся поўнага ахопу ліквпунктамі ўсіх няпісьменных і школамі ўсіх малапісьменных. Раённыя арганізацыі павінны забясьпечыць уздым работы Горацкай арганізацыі т-ва «ПН».

Каралёў.

Не дапускаць недаацэнкі

У Крупскім раёне яшчэ не распачата работа па ліквідацыі рэштак няпісьменнасьці, па ўвядзеньні ўсенавучу малапісьменных. З боку раённых арганізацый—райАНА, саюзу Працасьветы, т-ва «ПН»—наглядаецца недаацэнка гэтай важнейшай работы.

Пастанова СНК БССР аб увядзеньні ўсенавучу малапісьменных не знайшла ў раёне належнага ажыцьцяўленьня.

Не праведзена работа па ўліку няпісьменных і малапісьменных, па арганізацыі ліквпунктаў і школ малапісьменных. У раёне адсутнічаюць праграмы і падручнікі.

Неабходны рашучы пералом. Райком партыі павінен павесьці рашучую барацьбу з недаацэнкай ліквідацыі малапісьменнасьці і ліквбезу.

П. Л.

Тальскі сельсавет бязьдзейнічае

Па Тальскім сельсавеце (Любанскі раён) налічваецца каля 50 няпісьменных. Увесну і ўлетку, як толькі пачаліся палявыя работы, ліквпункты не працавалі. Зараз заняткі на ліквпунктах яшчэ не распачаты. Ні сельсавет, ні камсамольская арганізацыя нічога ня робяць, каб наладзіць работу па ліквідацыі няпісьменнасьці, увядзеньні ўсенавучу малапісьменных.

А. А.

Раўняцца на ліквпункт калгасу „1-га мая"

Ліквпункт калгасу «1-га мая», Увнацкага сельсавету (Крупскі раён) працуе па-ўдарнаму. Ён зьяўляецца ўзорам таго, як трэба весьці работу, каб да XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі дамагчыся суцэльнай пісьменнасьці.

З 15 верасьня ліквпункт наведвае 50 чал. Працуе на ліквпункце ў якасьці настаўніка камсамолец *Макрыцкі Сьцяпан*, які забясьпечыў добрую работу ліквпункту. Калгасьнікі якія наведваюць ліквпункт ўжо чытаюць і пішуць. Увядзена палітгадзіна.

Ліквпункт узяў на сябе абавязак—*скончыць работу да XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі*. Прыклад добрай работы ліквпункту калгасу «1-га мая» трэба шырока скарыстаць. Усе ліквпункты ня толькі Крупскага раёну, але і другіх раёнаў БССР, павінны раўняцца па ліквпункце калгасу «1-га мая».

В.

Цяпінскі сельсавет за сродкі ліквбезу набыў каня

Зусім не надана ўвагі ў Чашніцкім раёне справе ліквідацыі рэштак няпісьменнасьці, увядзеньню ўсенавучу малапісьменных.

Досыць сказаць, што няпісьменныя дапрызыўнікі 1910 году нараджэньня не навучаюцца на ліквпунктах.

У раёне няма ўліку няпісьменных і малапісьменных. Няпісьменных і малапісьменных падлічваюць «на вока». Па гэтым падліку няпісьменных значыцца 5 тысяч, а малапісьменных—каля 8 тысяч.

Дырэктывы, якія паступаюць ад цэнтральных устаноў, падшываюцца да справы. Не разгорнута ніякай работы па мабілізацыі савецкай грамадзкасьці на барацьбу з няпісьменнасьцю і малапісьменнасьцю.

Райсавет т-ва «ПН» бязьдзейнічае, нават не разгарнуў работы па падрыхтоўцы да III усебеларускага зьезду т-ва «Прэч няпісьменнасьць».

У выніку недаацэнкі ліквідацыі няпісьменнасьці і увядзеньня ўсенавучу малапісьменных з боку раённых арганізацый, сельскія саветы скарыстоўваюць бюджэты на ліквідацыю рэштак няпісьменнасьці і увядзеньне ўсенавучу малапісьменных на іншыя патрэбы. Так Цяпінскі сельсавет за сродкі ліквбезу набыў каня!

Раённая канфэрэнцыя «ПН» сарвана, на канфэрэнцыю апарата прадстаўнікоў райсавету «ПН» ніхто не зьявіўся.

Райком партыі павінен ўдарыць па тых, хто недаацэньвае такой баявой задачы, як ліквідацыя рэштак няпісьменнасьці і ўвядзеньне ўсенавучу малапісьменных і забясьпечыць бальшавіцкае разгортваньне гэтай справы.

Валодзька.

За што змагаецца т-ва „ПН"

1931-32 годзе т-ва «ПН» сваімі сі- і сродкамі ахапіла навучаньнем тыс. няпісьменных і малапісьменных 17 тыс. культармей-, мабілізавала 17 тыс. культармей-

раз перад таварыстам «ПН» ста- задача, змагаючыся за хутчэйшую ідацыю рэштак няпісьменнасьці, арнуць работу па ажыцьцяўленьні эктыў сакавікоўскага пленуму ЦК ЦКК КП(б)Б аб ліквідацыі малапісьнасьці сярод дарослага насельні-

ва «ПН» ставіць сваёй задачай: Ахапіць навучаньнем у 1932-33 чальным годзе 220 тыс. няпісьмен і малапісьменных.

— Давесьці культармію да 20 тыс. чал.

— Павялічыць лік членаў т-ва да 600 тыс. чал.

— Мабілізаваць 1.500 тыс. руб. грашовых рэсурсаў.

Выкананьне гэтай задачы патрабуе карэннай перабудовы і ўзмацненьня работы т-ва «ПН». III усебеларускі зьезд т-ва «ПН» павінен адыграць рашаючую ролю ў справе перабудовы работы т-ва, мабілізацыі ўсіх яго членаў і ўсёй пралетарскай грамадзкасьці на пасьпяховую ліквідацыю рэштак няпісьменнасьці, увядзеньне ўсенавучу для малапісьменных.

Каплан.

Ганчарным вырабам-асаблівую увагу

На а нове рашэньняў пленуму ЦК УсеКП(б) перабудаваць работу прамкаапэрацыі

Апошняя пастанова ЦК і СНК БССР аб перабудове работы і арганізацыйных формах прамысловай каапэрацыі ставіць ва ўсю шырыню задачу перабудовы прамысловай каапэрацыі і намячае для яе баявую праграму дзеяньня — зьніжэньне сабекошту прадукцыі, падвышэньне яе якасьці, выкананьне колькасных паказьнікаў і інш.

Аднак, ў радзе арцеляй, у іх цэхох і брыгадах, пастанова партыі і ўраду пакуль што яшчэ не рэалізавана і работа арцеляй не перабудавана ў адпаведнасьці з гэтымі рашэньнямі.

Доказам гэтага можа служыць Менская арцель шаўцоў, якая яшчэ да сёньняшняга дня не перабудавала сваёй работы. Як вынік з гэтага, зрываецца выкананьне прамфінпляну ідзе не ў гару, а ўніз. Так, у ліпені месяцы прамфінплян быў выкананы на 70 проц., а ў жніўні толькі на 56 проц. Якасныя паказьнікі яшчэ ніжэйшыя. Бываюць выпадкі, калі абутак трэба перарабляць.

Такія паказьнікі мы маем ня толькі ў шавецкай арцелі, а ў іншых арцелях.

Ёсьць і такія арцелі, як, напрыклад, пэчэшка-трыкатажная, якая за верасень месяц свой прамфінплян выканала на 110 проц. Арцель краўцоў за жнівень дала 96,6 проц. выкананьня пляну, зьніжэўшы брак да нуля.

Члены гэтых арцеляў бяруць на сябе канкрэтныя сустрэчныя абавязацельствы да дню ХУ гадавіны Кастрычніка, па выкананьні пляну па вырабе шырспажыву.

Аднак трэба сказаць, што на раду з дасягненьнямі ў гэтых арцелях няма плянавасьці ,слаба пастаўлен ўлік, адсутнічае барацьба за апэрацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне арцеляў.

Пастанова Кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б) павінна стаць асноўным і рашэючым вагаром у рабоце як партыйных, так і савецкіх арганізацый у справе перабудовы работы прамка апэрацыі.

Ганчарныя промыслы адстаюць

Ганчарныя вырабы—адна з важнейшых галін шырспажыву ў рабоце прамкаапэрацыі; на гэтыя вырабы ва лікі попыт на калгасным рынку. А між тым, гэтых вырабаў на калгасных рынках няма.

Паўстае-ж пытаньне—чаму-ж?

А таму, што вырабам ганчарнай прадукцыі займаюцца амаль выключна промыслы Самапрамкаапэрацыі. Белкам прамсавет гэтаму віду шырспажыву аддае мала ўвагі. Арганізацыя працы на промыслах слаба пастаўлена. Вучот працы кульгае. Промыслы не забясьпечаны ў дастатковай меры рабсілай. Наглядаецца цякучасьць, у выніку дрэнных бытавых умоў.

Вось, усё гэта разам узятае і стварыла такое становішча, што гадавы план па выпуску ганчарных вырабаў па сыстэме Белсампрамсавету на 1-IX выкананы на 17 проц.

Ганчарна-керамічны спэцсаюз павінен у найкарацейшы тэрмін ліквідаваць гэты недахоп.

Да Кастрычніцкіх сьвят прамфінплян павінен быць выкананы на 100 проц.

Ф.

Патрэбна ўмяшацельства ЦКК-РСІ

7-га кастрычніка—выдатная дата для супрацоўнікаў Спэцмэталяпрамсаюзу.

У гэты дзень, роўна а 10-ай гадз. раніцы ня гледзячы на распараджэньне Пракуратуры рэспублікі і Менкамгасу ня высяляць Спэцмэталяпрамсаюз з займаемага ім памяшканьня,—прадстаўнікі Вышэйшага савету фізкультуры ўдарамі ломаў і молатаў разбурылі сьцяну і захапілі памяшканьне Спэцмэталяпрамсаюзу.

Актарат у ліку 30 асоб ужо 4 дні ня можа прыступіць да работы, бо маемасьць саюзу, чарцяжы і сьметы капітальнага будаўніцтва захоплены ў палон пераможцамі.

Кіраўнік сыстэмы Белсампрамсавету т. Брыскін, прыбыўшы на месца, аўтарытэтна заявіў: «Я з вамі няньчыцца ня буду».

Уся гэта вахканалія адбываецца як-раз ў той час, калі сыстэма прамкаапэрацыі павінна бальшавіцкімі тэмпамі перабудоўвацца, па-ўдарнаму праводзіць справаздачна-перавыбарную кампанію.

ЦКК РСІ павінна зацікавіцца гэтай справай.

Спэцмэтальсаюз павінен тэрмінова атрымаць магчымасьць працаваць. бесьперабойна..

Прадстаўнік штабу пралетарскага буксіру пры ЦСПСБ—КАТЛЯРОЎ

Ударнікі апарату: Сэгаль, Каган, Рыпс, інжынэр Гайдаенка, Сагаловіч, Майзэль, Бусловіч, Пракошын, Фрыдлянд, Фэльдман і Багдановіч.

За рэалізацыю рашэньняў пленуму ЦК

Белсампрамсавет за апошні час не раключаўся на выпуск тавараў шырспажыву. На нізы спушчана рад канкрэтных дырэктыў аб вырабе прадметаў шырспажыву. Даны канкрэтныя праграмы па яго выпуску.

У выніку, на 1-га верасьня гадавы плян выпуску прадукцыі шырспажыву па сыстэме Бемсампрамсавету выкананы на 55,7 проц. Галоўнае месца ў ім займаюць кравецкія вырабы, асабліва для калгаснага рынку. Плян па выпуску кравецкіх вырабаў на 1-е верасьня выкананы на 57 проц. ці на 12.946.000 рублёў.

Але на гэтым Белсампрамсавет не павінен спыняцца. Барацьба за далейшае разгортваньне выпуску прадукцыі шырспажыву на грунце апошніх рашэньняў Пленуму ЦК, павінна легчы ў аснову работы Белсампрамсавету.

Адстаючыя вучасткі работы, як: рамонт абутку, ганчарныя промыслы, і асабліва вучот—павінны быць падцягнуты.

Адстаючы вучастак работы

Рамонт абутку мае вялікае значэньне ў рабочым забясьпечаньні, у асаблівасьці на сёньнешні дзень калі ў нас адчуваецца недахоп у абутку. Аднак, Белсампрамсавет у гэтай галіне зусім мала аддае ўвагі. Белсампрамсавет не адчыніў дастатковага ліку майстэрняў па рамонце абутку, дый тыя, што ёсьць, не ў дастатковым памеры забясьпечаны рабочай сілай і сыравінаю. Сярод рабочых наглядаецца цякучасьць, што зьяўляецца вынікам дрэнных бытавых умоў, слабай выхаваўчай працы.

Пастанова пленуму ЦК УсеКП(б) слаба папулярызавана ў арцелях. не кажучы ўжо аб іх рэалізацыі. У выніку ўсяго гэтага выкананьне гадавога пляну па рамонце абутку па ўсёй сыстэме Белсампрамсавету выканана толькі на 32 проц.

Рамонт абутку з адстаючага вучастку працы павінен стаць перадавым.

Фэльдман.

Улік не на належнай вышыні

У апошнім рашэньні пленуму ЦК УсеКП(б) аб прамкаапэрацыі ўказваецца, што ўлік у прамкаапэрацыі зьяўляецца слабым месцам; што ўліковыя сэктары павінны быць укамплектаваны.

Між тым, Белсампрамсавет нічога не зрабіў па рэалізацыі пастаноў пленуму ЦК. Уліковыя сэктары ў аб'яднаньнях Белсампрамсавету яшчэ і на сёньнешні дзень не ўкамплектаваны. У выніку чаго кульгае ўлік працы і справаздачнасьць.

Ды і ў самім Белсампрамсавеце справаздачнасьць не на належнай вышыні. На 8 кастрычніка яшчэ няма паказьнікаў выкананьня прамфінпляну за 1 дэкаду верасьня.

Прэзыдыўм Белсампрамсавету павінен прыняць належныя захады да наладжаньня ўліку.

Свой.

А. Чарвякоў

Задачы таварыства „Прэч няпісьменнасьць“ на новым этапе

Магутным напорам пралетарскай грамадзкасьці пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі БССР дамагаецца вялізарнейшых гістарычнага значэньня посьпехаў на фронце барацьбы за ліквідацыю няпісьменнасьці. Агульная пісьменнасьць БССР узынялася з 31,9 проц. у 1920 годзе да 95 проц. у 1932 г. Цэлы рад гарадоў і раёнаў БССР рапартавалі да 1-га мая г-г. аб пераўтварэньні іх у гарады і раёны суцэльнай пісьменнасьці.

Гэтых посьпехаў БССР дамагаецца толькі дзякуючы пралетарскай рэвалюцыі, на подставе рашучага змаганьня за генэральную лінію партыі, за аксіяцыяльненьне ленінскай нацыянальнай. Пераўтварэньне БССР з краіны суцэльнай няпісьменнай у краіну суцэльнай пісьменнасьці—зьяўленьне новым руйнуючым ударам па ўсіх варагах рабочай класы і пралетарскай рэвалюцыі, зьяўленьне вынікам рашучай барацьбы пад кіраўніцтвам партыі супроць апартуністычных элементаў розных колераў.

Трэба падкрэсьліць вялізарную ролю ў барацьбе за суцэльную пісьменнасьць Т-ва «Прэч няпісьменнасьць», якое здолела арганізаваць 30-тысячную армію культармейцаў—актыўных барацьбітоў культурнай рэвалюцыі з рабочых, калгасьнікаў, настаўніцтва, камсамольцаў і здолела навучыць сваімі сіламі 180.000 няпісьменных у БССР за апошнія 2 гады.

У сучасны момант БССР разам з усім Саюзам саюзам пасьпяхова эмаецца за заканчэньне першай пяцігодкі ў 4 гады і рыхтуецца да ўступленьня ў 2-ю пяцігодку, пяцігодку бяклясавага сацыялістычнага грамадзтва. Ажыцьцяўленьне гэтай вялізарнага гістарычнага значэньня рэшэньняў XVII канфэрэнцыі УсеКП(б) высоўвае новыя яшчэ больш складныя задачы на фронце культурнага будаўніцтва, на фронце барацьбы за суцэльную пісьменнасьць, каб сам... нічаць хутчэйшаму пераўтварэньню ўсіх працоўных гораду і вёскі ў сацыялістычнага грамадзтва. Завяршэньне асноўным справы па ліквідацыі пісьменнасьці сярод дарослага насельніцтва БССР стварыла ўмовы для вырашэньня новых задач у барацьбе за суцэльную пісьменнасьць, што зьяўляецца канкрэтным ажыцьцяўленьнем гістарычных пастаноў XVII партыйнай канфэрэнцыі.

Згодна пастановы ЦК і СНК у БССР уводзіцца абавязковае навучаньне для малапісьменных працоўных БССР. У 1932-33 навучальным годзе мы прыступілі да вырашэньня гэтай адказнай складанай задачы. Барацьба за ўсеагульнае навучаньне малапісьменных працоўных БССР павінна зьявіцца асноўнай задачай, для вырашэньня якой т-ва «Прэч няпісьменнасьць» павінна мабілізаваць усе свае сілы. Ужо ў гэтым годзе т-ва «Прэч Няпісьменнасьць» павінна заняць пачэснае месца ў вырашэньні гэтай задачы, гэта эн., што сёлета т-ву «Прэч няпісьменнасьць» трэба ахапіць навучаньнем звыш 450.000 малапісьменных. Для гэтай мэты неабходна мабілізаваць культармію каля 12.000 чалавек, арганізаваць каля 6.000 школ малапісьменных. Пры вырашэньні гэтай задачы неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на якасны бок работы. Барацьба з малапісьменнасьцю ставіць сваёй мэтай укараненьне сярод дарослага насельніцтва ведаў у аб'ёме 4-х годкі з уключэньнем у праграму грамадазнаўства і тэхнічных ведаў. Ліквідацыя малапісьменнасьці ставіць сваёй мэтай хутчэйшае пераўтварэньне ўсяго дарослага насельніцтва ў сьвядомых і актыўных барацьбітоў за справу камунізму. Адсюль відаць, што работа па арганізацыі школ малапісьменных патрабуе асаблівай ўвагі да падбору адпаведных кадраў культармейцаў і мэтадычнага кіраўніцтва.

Разам з гэтай новай задачай т-ва «Прэч няпісьменнасьць» павінна працягваць работу па канчатковай ліквідацыі няпісьменнасьці ў БССР. Трэба прызнаць, што на пляцдзячы на агульна-здавальняючыя вынікі па барацьбе з ліквідацыяй няпісьменнасьці за мінулы час, у асобных раёнах і сельсаветах ёсьць значныя прарывы і недахопы ў гэтай рабоце. Улік прызьначэньняў гэтага году паказвае, што па цэлым радзе раёнаў сярод прызьначэньняў і сёлета яшчэ ёсьць няпісьменныя. Ганьбой для раённага кіраўніцтва, грамадзкасьці і, у першую чаргу, для т-ва «Прэч няпісьменнасьць» трэба лічыць тое, што сярод прызьначэньняў Веткаўскага, Лельчыцкага, Талачынскага, Плешчаніцкага, Дубровенскага, Нараўлянскага, Заслаўскага і інш. раёнаў налічваецца значная колькасьць няпісьменных. Асобныя раёны яшчэ далёка не дамагліся поўнай ліквідацыі няпісьменнасьці. Вось гэта і ганебныя плямы ў БССР трэба тэрмінова высьветліць, каб накіраваць туды дапамогу на ліквідацыю прарываў, на канчатковую ліквідацыю няпісьменнасьці. Гэтая задача ў першую чаргу стаіць перад т-вам «Прэч няпісьменнасьць».

Ня менш важная роля т-ва заключаецца ў падрыхтоўцы масавых кадраў і таму т-ва павінна ўзяць на сябе пэўны абавязак па арганізацыі курсаў, па ўкараненьні тэхнічных ведаў, асабліва аправедаў, па падрыхтоўцы ўсялякага роду нізавых кадраў для розных галін народнай гаспадаркі. Акрамя гэтых канкрэтных задач непасрэднага навучаньня, перад т-вам стаіць таксама задача па арганізацыі пралетарскай грамадзкасьці на дапамогу саветам і органам НК Асьветы як у цэнтры, гэтак і на месцах у іх рабоце.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР, выносячы сваю пастанову аб ліквідацыі малапісьменнасьці, выходзілі з таго, што гэта задача будзе вырашана пасьпяхова толькі ў тым выпадку, калі на яе ажыцьцяўленьне будуць мабілізаваны пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ўсе сілы пралетарскай грамадзкасьці. Гэты заклік ЦК КП(б)Б і СНК БССР укладае на т-ва «ПН» асабліва адказныя абавязкі.

Т-ва «Прэч няпісьменнасьць» зьяўляецца і павінна зьяўляцца масавай арганізацыяй, што мабілізуе і арганізуе масы рабочых калгасьнікаў, настаўніцтва, усю працоўную інтэлігенцыю і ўсіх працоўных на барацьбу супроць няпісьменнасьці. Т-ва «Прэч няпісьменнасьць»—масавая арганізацыя, якая мае свае ячэйкі на кожнай фабрыцы, заводзе, у кожным саўгасе, калгасе, у вёсцы, навучальных установах і т. д. Мы значна перавысілі тэмпы ліквідацыі няпісьменнасьці, завяршыўшы у асноўным гэтую справу ў 1932 годзе замест вызначанага згодна пляну 1935 году толькі дзякуючы таму, што пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі былі мабілізаваны сілы пралетарскай грамадзкасьці БССР. Гэта зьяўляецца таксама неабходнай умовай для перамогі і ў далейшай барацьбе. Т-ва «ПН», зьяўляючыся масавай арганізацыяй, будзе адыгрываць вялізарнейшую ролю і ў далейшай барацьбе за ліквідацыю няпісьменнасьці і малапісьменнасьці.

Важнейшай задачай т-ва «ПН» зьяўляецца ўкараненьне ў масы сьвядомасьці аб значэньні барацьбы за суцэльную пісьменнасьць, арганізаваны ахоп усіх няпісьменных і малапісьменных, арганізацыя грамадзкага кантролю за імі з мэтаю прыцягненьня іх на ліквпункты і школы малапісьменных.

Асноўным зьвяном у сыстэме т-ва «Прэч няпісьменнасьць» павінна зьяўляцца нізавая ячэйка. Уся канкрэтная работа т-ва павінна ўскладацца непасрэдна на нізавую ячэйку. Ячэйка «ПН» павінна зьяўляцца штодзённым барацьбітом за суцэльную пісьменнасьць непасрэдна ў масах, дапамагаць органам НКАсьветы ў справе далкладнага вучоту няпісьменных і малапісьменных, прымушаючы іх да ліквпунктаў і школ малапісьменных, стварэньня кадраў культармейцаў, іх падагітацыі і агульнай падрыхтоўкі, арганізацыі ліквпунктаў, забяспечаньня школ і ліквпунктаў неабходным памяшканьнем, абсталяваньнем, падручнікамі, настаўнікамі і г. д.

Новыя задачы, што пастаўлены перад т-вам, патрабуюць рашучай перабудовы работы ўсёй сыстэмы т-ва ў бок рашучай ліквідацыі абязьлюдзьлі, устанаўленьня адказнасьці за работу як у цэнтральных, гэтак раённых і нізавых яго зьвяньнях.

З усяго гэтага відаць вялізарнае значэньне далейшай работы т-ва «Прэч няпісьменнасьць» як у цэнтры гэтак і на месцах. Задача партарганізацый, саветаў, прафсаюзаў і камсамолу заключаецца ў тым, каб арганізаваць ячэйкі т-ва, каб дапамагчы ім у рабоце, забясьпечыўшы неабходнае падтрымваньне і кіраўніцтва. Перадавікі-ударнікі фабрык і заводаў, саўгасаў і калгасаў, навуковых і навучальных установаў павінны лічыць сваім абавязкам зьяўляцца членам т-ва «Прэч няпісьменнасьць» і прымаць актыўны ўдзел у рабоце апошняга.

Барацьба за суцэльную пісьменнасьць зьяўляецца адным з важнейшых умоў у справе барацьбы за канчатковую перамогу сацыялізму, у справе барацьбы за стварэньне бесклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Усе ўдарнікі барацьбы за сацыялізм—на дапамогу т-ву «Прэч няпісьменнасьць» на новым этапе яго работы!

Да XV гадавіны рапартаваць аб канкрэтных выніках барацьбы за пяршынства раёну

МСЬЦІСЛАЎ. Пашыраны пленум Мсьціслаўскага райвыканкому прайшоў пад знакам пад'ёму вялікай актыўнасьці калгаснага актыву і ўсіх выбаршчыкаў саветаў. Восьмсот удзельнікаў пленуму з ўсёй сур'ёзнасьцю і дзелавітасьцю падагулілі вынікі выкананьня раёнам гаспадарча-палітычных задач за 3 кварталы 1932 году і абгаварылі чарговыя задачы па завяршэньні першага этапу барацьбы за пяршынства раёну ў СССР.

Мсьціслаўскім раёнам за мінулыя 3 кварталы 1932 году дасягнута ня мала посьпехаў у барацьбе за пяршынства раёну. На асноўных вучастках сацыялістычнага будаўніцтва забясьпечана выкананьне пастаўленых перад раёнам партыяй і ўрадам задач. Пасьпяхова праведзены веснавая сяўба, уборка, мабілізацыя сродкаў і іншыя кампаніі. Усе гэтыя посьпехі дасягнуты Мсьціслаўскім раёнам толькі ў выніку няўхільнага і пасьлядоўнага правядзеньня генэральнай лініі партыі, у барацьбе з правым апартунізмам, «левымі» загібамі і прымірэнцтвам да іх. Рад сельскіх саветаў, калгасаў паказалі ўзорныя бальшавіцкія прыклады барацьбы за пяршынства раёну (Старасельскі, Падсолтаўскі).

Побач з дасягнутымі посьпехамі пленум разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкай адзначыў недапушчальнае адставаньне раду сельсаветаў і калгасаў у выкананьні пляну асеннякі сяўбы, збожжазагатовак, сіласаваньня і інш.

Задачы, якія стаяць перад раёнам у барацьбе за пяршынства ў СССР, несумяшчальны з наяўнасьцю адставаньняў на асобных вучастках работы па выкананьні народна-гаспадарчага пляну раёну. Гэтыя задачы з вялікай сур'ёзнасьцю патрабуюць ад сельсаветаў калгаснай, каапэрацыйнай сыстэмы і ўсіх арганізацый максымальна моткай пастаноўкі работы, глыбокай перабудовы ўсіх зьвеньняў работы, колькаснага і якаснага палепшаньня работы, узьдыму на яшчэ больш прынцыповую вышыню задачы барацьбы за пяршынства раёну.

Пашыраны пленум Мсьціслаўскага РВК з мэтай пасьпяховага завяршэньня да XV гадавіны Кастрычніка ўсіх мерапрыемстваў па выкананьні Сіменьнікаўскага сандагавору, пры адназгоднай падтрымцы ўсіх дэлегатаў пленуму **абвясьціў з 1 кастрычніка па 1 лістапада «МЕСЯЧНІК ШТУРМУ».** Месячнік штурму ставіць перад сабой задачу завяршэньня пэршага этапу барацьбы за пяршынства раёну ў СССР імя XV-годзьдзя Кастрычніка. Асноўныя задачы месячніка—поўная ліквідацыя адставаньня асобных вучасткаў работы ў раёне і ў асабліваасьці па сельскай гаспадарцы.

У раёне была праведзена адпаведная падрыхтоўчая работа па правядзеньню месячніка. Ва ўсім раёне была разгорнута работа па папулярызацыі мерапрыемстваў, намечаных для правядзеньня ў часе месячніка. Праведзены сходы партячэек, прафарганізацый, камсамолу, прамарцеляй. Праводзіліся пашыраныя пленумы сельсаветаў, агульныя сходы калгасьнікаў і калгасьніц і бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў.

Намечаны цэлы рад мерапрыемстваў па датэрміновым выкананьні пляну загатовак (збожжа, лёну, бульбы, мяса і інш. відаў), па сканчэньню сіласаваньня, падняцьця зябу. Ужо зараз намечаны мерапрыемствы па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Мабілізаваны масы на выкананьне пляну мабілізацыі родкаў насельніцтва, разьмеркаваньне ўраджаю, укамплектаваньне фэрм і гаспадарчага росту саўгасаў. Намечаны рад мерапрыемстваў па палепшаньні культурнай і арганізацыйна-масавай работы.

Усе гэтыя мерапрыемствы накіраваны на арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, на максымальнае выкарыстоўваньне актыўнасьці працоўных мас, на выкананьне народна-гаспадарчага пляну раёну.

Абапіраючыся на рост высокай палітычнай актыўнасьці працоўных мас, пад кіраўніцтвам партарганізацыі раёну,—працоўныя Мсьціслаўшчыны могуць і павінны дабіцца сапраўды вялікіх посьпехаў у барацьбе за пяршынства раёну, у барацьбе за завяршэньне з найлепшымі паказальнікамі апошняга году першай пяцігодкі, за замацаваньне перадавых пазыцый у другой пяцігодцы.

Для апэрацыйнага кіраўніцтва месячнікам арганізаваны райштаб у складзе 7 асоб пад старшынством тав. Кадукова. Штабам выпрацаваны канкрэтны плян работы месячніка. Арганізаваны таксама штабы па сельсаветах. У калгасах, саўгасах, вёсках, арганізаваны штурмавыя пяцёркі.

Для дапамогі адстаючым сельсаветам мабілізаваны на гэты месяц рай і сельпартактыў. Мабілізаваны таксама камсамольскі і беспартыйны актыў. З перадавых сельсаветаў арганізаваны спэцыяльныя ўдарныя—буксірныя брыгады для аказаньня сацыялістычнай дапамогі адстаючым. Абвешчаны заклік новых ударнікаў сацыялістычнай працы імя XV-годзьдзя Кастрычніка. Створаны прэм'яльны фонд пры штабе. У дзень XV-годзьдзя Кастрычніка намечана перадаць перадавым сельсаветам, **пераходны чырвоны сьцяг.**

Мерапрыемствы, намечаныя месячнікам штурму, былі спатканы ўдзельнікамі пленуму з вялікім энтузіязмам. Уся работа пленуму праходзіла пад лёзунгам— **«У перадавым раёне не павінна быць адстаючых вучасткаў работы».** Гэты лёзунг павінен быць ажыцьцёўлены ўсімі арганізацыямі, кожным калгасам, саўгасам, і кожным працоўным раёну ў пасобку.

Усе партыйныя, савецкія, прафсаюзныя, камсамольскія арганізацыі і ўсе працоўныя раёну павінны накружыць усе свае сілы і энэргію і па-баявому выканаць задачы, якія пастаўлены месячнікам штурму. З большай энэргіяй драцца за апрацоўваньне ўзятых раёнам вялізарнейшых абавязкаў перад рэспублікай Саветаў—быць перадавым сельска-гаспадарчым раёнам Савецкага саюзу. Для выкананьня гэтых задач ёсьць усе падставы і магчымасьці. Гэтыя магчымасьці даказаны практычнай работай за апошні год.

М.

ЗА ГРАНІЦАЙ

Беспрацоўныя захопліваюць грузавікі з хлебам і прадуктамі

ЛЁНДАН, 14-Х. Сёньня ў Бэльфасьце зноў адбыліся хваляваньні, якія суправаджаліся захопам беспрацоўнымі грузавікоў з хлебам і малочнымі прадуктамі. Адбыліся сутычкі паміж беспрацоўнымі і паліцыяй. Усе банкаўскія будынкі знаходзяцца пад узмоцненай аховай. На вуліцы Фалло Роўд, дзе ўчора адбываліся жорсткія сутычкі, атрад моцна ўзброенай паліцыі сагнаў усіх беспрацоўных з парогі і прымусіў іх разабраць барыкады, а таксама зрабіць рамонт усіх будынкаў, якія былі ўчора пашкоджаны.

Паліцыя ўчыніла шматлічныя арышты беспрацоўных, якія здмовіліся ад гэтай работы. Паводле думкі друку, пабудова барыкад і знаходжаньне зброі ў беспрацоўных сьведчыць аб актыўнасьці Ірландзкай рэспубліканскай партыі, а таксама аб тым, што беспрацоўныя дзейнічаюць арганізавана і плянава.

Замяшаньне ў вярхох гітлераўнаў

БЭРЛІН, 14-Х. Выступленьне Гітлера на прадвыбарчым сходзе ў горадзе Гюнцбурзе (Паўночная Баварыя) сьведчыць аб тым, што кіраўніцтва нацыянал-сацыялістаў у значнай ступені страціла свае папярэднія намеры.

«Калі я,—гаварыў Гітлер,—згаджуся узяць які-небудзь міністэрскі пост, дык зраблю я гэта толькі таму, што мне гэтак дыктуе сьвядомасьць абавязкаў. А калі лёс захоча, каб нацыянал-сацыялісты ўзялі ўладу, дык яны возьмуць на сябе гэту адказнасьць. Калі-ж лёс вызначыў іх, нацыянал-сацыялістаў, толькі для падрыхтоўкі лепшай будучыні, дык яны і ў гэтым выпадку выканаюць свой абавязак».

У гэтай прамове Гітлера яскрава адбілася замяшанасьць нацыянал-сацыялістскага кіраўніцтва ў сувязі з паступовым падзеньнем уплыву і аўтарытэту кіраўнікоў нацыянал-сацыялістаў у нізавых масах партыі.

Міжнародны дзіцячы тыдзень у Германіі

БЭРЛІН, 13-Х. Міжнародны дзіцячы тыдзень (ад 2-га да 10-га кастрычніка) праходзіў у Германіі ў аўтаноўцы крайняга націску з боку дзяржаўных паліцэйскіх уладаў. Прускае міністэрства ўнутраных спраў выдала загад забараніць усе піянэрскія дэманстрацыі і сходы.

Ня гледзячы на гэтыя мерапрыемствы, накіраваныя для задушэньня піянэрскай кампаніі, міжнародны дзіцячы тыдзень прайшоў са значным посьпехам. У Бэрліне было выдана і прадана некалькі тысяч нумароў піянэрскай газэты «Барабан» і створана пяць новых піянэрскіх сэкцый.

У Бэрліне, Рэйнскай вобласьці, Вэстфаліі, Паўночнай Германіі і Саксоніі адбыліся дэманстрацыі пралетарскіх дзяцей. Піянэры разгарнулі рух пратэсту супроць забароны піянэрскага кангрэсу.

Забарона „Саюзу прыхільнікаў СССР“ у Чэхаславакіі

ПРАГА, 13-Х. Чэхаславацкая тэлеграфнае агенцтва паведамляе: Сёньня праская паліцыя забараніла дзейнічаць арганізацыі «Саюзу прыхільнікаў СССР» у Празе. На маемасьць і архіў арганізацыі накладзены арышт.

ПАЗШ і СССР

НЬЮ-ЁРК, 13-Х. Газэты трэсту «Скрыпс Говард» камэнтуючы ўзнагароду ордэнамі працоўнага Чырвонага сьцягу амэрыканскіх інжынэраў зазначае, што ўдзел амэрыканскіх інжынэраў у савецкім будаўніцтве зьяўляецца лішняй прычынай для прызнаньня ПАЗШ СССР. Паводле слоў газэты трэсту, адныя палітычныя дзеячы і фінансісты Амэрыкі выказваюцца за прызнаньне Савецкага саюзу, усьведамляючы вялізарныя перавагі гандлю з СССР.

Амэрыканскі доук аб Днепрагэсе

НЬЮ-ЁРК, 13-Х. Амэрыканскі друк публікуе на відным месцы артыкулы аб пуску Днепрагэсу. Буржуазны друк ня скрывае свайго зьдзіўленьня перад дасягненьнямі Савецкага Саюзу.

Газэта «Нью-Ёрк івінг пост» прызнае «пасьпяховае завяршэньне аднаго з галоўных праектаў, прадугледжаных пяцігодкай».

«Бязумоўна, — піша газэта,—пабудова Дняпроўскай станцыі зьяўляецца вяршынёй тэхнікі, якой магла-б ганарыцца кожная краіна». **«Балтімор сен»** зазначае, што для «чалавека, які здольны хоць на час забыцца пра розьніцу эканамічных с..., Днепрабуд зьяўляецца надхніцельным здарэньнем».

Барыкадныя баі беспрацоўных у Бэльфасьце

ЛЁНДАН, 12-Х. У Бэльфасьце (сталіца паўночнае Ірляндыі) адбыліся жорсткія вулічныя сутычкі паміж беспрацоўнымі і паліцыяй.

Беспрацоўныя арганізавалі дэманстрацыю па вуліцах гораду, патрабуючы дапамогі. Улада гораду забараніла беспрацоўным зьбірацца на вуліцы, разьмясьціўшы ў стратэгічных пунктах звыш 2.000 паліцэйскіх, узброеных рэвольверамі і вінтоўкамі. Бранявыя аўтамабілі, грузавікі са сталёвымі камерамі для арыштаваных разьяжджалі па вуліцах гораду.

Калі паліцыя паспрабавала разагнаць дэманстрантаў, беспрацоўныя пачалі супраціўляцца. На накалькіх вуліцах былі зроблены барыкады. Рабочыя кідалі ў паліцыю цагліны і каменьні з бруку. Шмат жанчын дапамагалі дэманстрантам, падаючы ім каменьне і цэглу. Паліцыя некалькі разоў была вымушана адступаць, але потым прыбылі на бранявікох новыя атрады паліцэйскіх, якія пачалі абстрэльваць беспрацоўных з рэвольвераў. Барыкады былі падпалены паліцыяй. З вялікаю цяжкасьцю паліцыя адцясьніла два 8 і 10-тысячныя натоўпы беспрацоўных з цэнтральных вуліц. Аднак, лютая барацьба працягвалася на бакавых вуліцах.

Ня гледзячы на паліцэйскі агонь, беспрацоўныя мужчыны і жанчыны не разыходзіліся і з выгукамі: «мы патрабуем хлеба» разброілі рад паліцэйскіх, ў тым ліку інспэктара паліцыі. Спалена і разгромлена шмат магазынаў. Пашкоджана каменьнямі значная колькасьць трамваяў і аўтабусаў. Разгромлена і спалена некалькі грузавікоў, якія перавозілі прадукты харчаваньня і вугаль.

У выніку вулічных сутычак, якія цягнуліся ўвесь дзень, забіта 3 чалавекі і паранена 100, у тым ліку, паліцэйскія і падарожнікі, 40 беспрацоўных арыштавана, пасаджана ў турму па абвінавачаньні ў спробах да «паўстаньня» і ў «забойстве». Рабочыя ад наго з Бэльфасцкіх прадпрыемстваў забаставалі ў знак салідарнасьці з беспрацоўнымі. Да позьняй ночы ў розных раёнах гораду працягваліся пажары.

Вы каны новыя паліцэйскія падмацаваньні, якія бесьперапынна прыбываюць ў горад. Войскам дадзены загад быць ў баявой падрыхтаванасьці. Кардоны паліцыі абкружаюць горад, не дапускаючы нікога акрамя афіцыйных асоб. Улада аддала загад пра...ышт усякага, хто зьявіцца на вуліцы паміж 11-ю вечара і 5-ю гадзінаю раніцы. Члены Бэльфасцкага муніцыпалітэту зьвярнуліся да мэра гораду з просьбаю склікаць нараду і патрабаваць ад ураду прыняць тэрміновыя меры. (ТАС).

Кампартыя Англіі заклікае рабочых падтрымаць барацьбу беспрацоўных

ЛЁНДАН. 14-Х. Баявое выступленьне беспрацоўных выклікала трывогу сярод мясцовых уладаў. Міністар унутраных спраў Ульстэра абяцаў дэлегацыі беспрацоўных прыняць меры для задаволеньня іх патрабаваньняў (беспрацоўныя патрабуюць павялічэньня дапамогі). Прэм'ер міністэрскага ўраду Крэгевон таксама абяцаў неадкладна абгаварыць пытаньне аб дапамозе беспрацоўным. У той-жа час прэм'ер пагражаў рэпрэсіямі тым, «якія імкнуцца да стварэньня Ірландзкай рэспублікі».

Сакратарыят англійскай кампартыі апублікаваў з прычыны здарэньня ў Бэльфасьце адозву, у якой адзначае значэньне баявога выступленьня бэльфасцкіх беспрацоўных. Паводле слоў адозвы, баі ў Бэльфасьце надалі новы выгляд галоднаму паходу, які арганізуецца. Адозва заклікае ўсіх англійскіх рабочых падтрымаць барацьбу беспрацоўных і арганізаваць масавыя дэманстрацыі.

Італьянска-германская эканамічная барацьба

РЫМ, 13-Х. Прынятыя Германіяй аб межаваньні па вывазе і ўвозе, выклікалі ў адказ меры з боку Італіі, што ставіць пад пагрозу эканамічныя адносіны паміж Італіяй і Германіяй. Італьянскі друк зазначае, што германскія мерапрыемствы зьяўляюцца парушэньнем італа-германскага гандлёвага дагавору і зазначае на магчымасьць скасаваньня яго, калі Германія не адменіць абмежаваньняў.

За апошні час у радох кампартыі Германіі значна павялічыўся лік сялян. Паліцыя у сувязі з гэтым ужывае ўсялякія рэпрэсіі і тэрарызуе сялянства.

НА ЗДЫМКУ: селянін расказвае сваім таварышам аб тым, як паліцыя шукаючы ў яго камуністычнай літара туры перарыла ўсё ў хляве.

У фашысцкай Польшчы

Сялянскія паўстаньні на Заходняй Украіне

Варшава, 11-Х. (Ул. інф. «Правда»). Паводле паведамленьня Бэрлінскай «Украінішэ корэспондэнц», паўстаньне сялян у Заходняй Украіне прычыняе усё больш вострыя формы.

Партызанскія атрады найбольш актыўна выступаюць у раёне Прышаніц на тэрыторыі, якая ахапляе каля 100 кв. клм. Партызаны ўмацаваліся ў акопах, што засталіся ад імпэрыялістычнай вайны. Баі адбываюцца пераважна ноччу. Партызаны трымаюць у сваіх руках ініцыятыву, учыняючы налеты на польскія ваенныя атрады. Тры спарты польскіх параненых салдат ідуць уначы з Ковелю на Любліін.

21-га верасьня ўсе польскія пяхотныя часьці былі адцягнуты з раёну паўстаньня. Далейшую барацьбу супроць партызан вядуць у сучасны момант узмоцненыя кавалерыйскія атрады і буйныя паліцэйскія сілы, сьцягнутыя з Варшаўскага і Люблінскага ваяводзтваў. Гэта перагрупоўка была выклікана недастатковай надзейнасьцю пяхотных часьцей, як гэта было ў 50-тым пяхотным палку, які вёў Повурскам бяз бою прапусьціў абкружаны з усіх бакоў партызанскі атрад. Неаднаразова групы салдат, пасланыя ў выведку, пераходзілі на бок паўстанцаў.

«Украінішэ корэспондэнц», абвяргаючы зьвесткі аб недахопе зброі ў паўстанцаў, піша: «Гэту зброю ўкраінскія сяляне маюць яшчэ з часу сусьветнай і ўкраінска-польскай вайны, а часткова яна захоплена ў апошні час у баёх з польскімі акупантамі».

Кавалерыйскія і паліцэйскія сілы абкружылі шчыльным кальцом раёны партызаншчыны. Усе прылягаючыя мясцовасьці перапоўнены карнымі экспэдыцыямі.

У адным толькі Повурску па прыгавору палявых судоў па працягу апошніх двух тыдняў павешана каля 60 сялян.

Катаржны прыгавор над рэвалюцыйнымі салдатамі

ВАРШАВА, 13-Х. Гэтымі днямі ў Вільні (Заходняя Беларусь) закончыўся буйны палітычны працэс 27 салдат, якія абвінавачваліся ў прыналежнасьці да кампартыі Заходняй Беларусі. Тры падсудныя **засуджаны на 9 год, 14—на 5 год, і 10—на 1 год катаржнай турмы кожны.**

Сацыял-фашысты сарвалі забастоўку

ВАРШАВА, 13-Х. У выніку згоды з магістратам, падпісанай фашысцкім профсаюзам (які далучаецца да групы Яворскага), забастоўка рабочых варшаўскага газавага заводу сарвана. На падставе гэтай згоды пытаньне аб скарачэньні зарплаты перадаецца на вырашэньне ўрадавай арбітражнай камісіі. Згода прадугледжвае таксама значнае пагоршаньне ўмоў працы.

Наперакор намаганьням фашысцкіх і сацыял-фашысцкіх профсаюзаў, нам удалося сарваць барацьбу рабочых газавага заводу, забастовачныя настроі сярод варшаўскіх камунальных рабочых узмацняюцца. 11-га кастрычніка адбыўся мітынг варшаўскіх трамвайшчыкаў, на якім рад рабочых выступалі за абвяшчэньне новай забастоўкі для таго, каб дабіцца павышэньня зарплаты і палепшаньня ўмоў працы.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“
Каса з 1 г. дня
Замежны мастацкі фільм
РЭЎНАСЬЦЬ
Звыш праграмы. Кіно-хроніка Саюзкіно

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“
Каса ад 12 гадз.
Ад 11 кастрычніка
Замежны спартыўна прыгодніцкі фільм
Адзінаццаць чартоў
Звыш праграмы Кіно-хроніка Саюзкіно

16 кастрычніка, а 9 гадзіне ўвечары адбудзецца
ўсебеларуская радыё-пераклічка па падрыхтоўцы да
правядзеньня XV гадавіны Кастрычніка ае рэвалюцыі
Пераклічка адкрываецца выступленьнем
Старшыні ЦВК т. ЧАРВЯКОВА

Даводзіцца даведама ўсіх
трымацеляў білетаў
1-й усесаюзнай лётарэі
„УСЕРААБПОМУ“
што тыраж лётарэі
адбудзецца
20-га кастрычніка
б. г. у гор. Растове на Дану.

Рэдакцыі газэты „Савецкая Беларусь“
ПАТРЭБНЫ СТЫЛЬРЭДАКТАРЫ
Плата па згодзе

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА № 70
Менскага Гарадзкога Савету Рабочых Сялянскіх і Чырвонаармейскіх дэпутатаў
„Пра ўвядзеньне ўсеагульнага абавязковага навучаньня на базе 7-гадовай палітэхнічнай школы“
14 кастрычніка 1932 г. г. Менск

На падставе пастановы СНК БССР ад 6 жніўня 1932 г., Менскі гарадзкі савет ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Увесьці ў 1932-33 навучальным годзе ўсеагульнае абавязковае навучаньне дзяцей у аб'ёме 7-гадовай школы, устанавіўшы абавязковае праходжаньне поўнага курсу 7-гадовай школы для ўсіх дзяцей, якія канчаюць 1-шы канцэнтр (4-ю групу), а таксама і для тых дзяцей, якія зараз навучаюцца у старэйшым канцэнтры 7-гадовай школы.

2. Абавязаць усіх бацькоў і асоб іх замяняючых, якія пражываюць на тэрыторыі гор. Менску і раёну, зьмясьціць у бліжэйшыя школы (ад месца іх жыхарства) дзяцей, падлягаючых усеагульнаму абавязковаму навучаньню згодна п. 1 гэтай пастановы.

3. Абавязаць бацькоў і асоб іх замяняючых у выпадку пропуску вучэбных заняткаў дзецьмі школьнага ўзросту, паведамляць аб гэтым школу з паказаньнем прычын гэтых пропускаў.

УВАГА: а) Вучань можа пакінуць школу да поўнага сканчэньня курсу ў выпадку ад'езду бацькоў, альбо асоб іх замяняючых у другія мясцовасьці для сталага пражываньня, або па хваробе, якая перашкаджае вучобе.

б) адказнасьць за свайчасовае зьмяшчэньне ў школы дзяцей (падлягаючых усенавучу), якія знаходзяцца ў дзіцячых дамох і іншых выхаваўчых установах, ускладзецца на загітаваў гэтых устаноў

в) уважлівымі прычынамі несвайчасовага зьмяшчэньня дзяцей у школы зьяўляецца: хвароба, фізычныя і псыхічныя дэфэкты дзяцей. Ва ўсіх гэтых выпадках патрабуецца прадстаўленьне ў бліжэйшую школу пасьведчаньне ўрача.

4. Забараніць скарыстоўваньне дзяцей школьнага ўзросту для гандлю на базарах, вуліцах і г. д., а таксама продажу ім вінных напіткаў, табаку і папіросаў і ігральных карт.

5. Вінаватыя ў парушэньні гэтай абавязковай пастановы прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасьці—штраф да 100 руб. або прымусовая праца да 2-х тыдняў.

6. Нагляд за выкананьнем гэтай пастановы ўскладзьці на гараны загадчыкаў школ, жакты, сельсаветы і міліцыю.

Гэтая абавязковая пастанова ўваходзіць у моц праз 7 дзён з часу апублікаваньня.

Нам. старшыні Менскага гарадзкога савету КАРАНЕЎСКІ
Сакратар ЛЮЦЬКО

БЕЛДЗЯРЖКІНО
даводзіць да ведама ўсіх, хто падаў дакументы для паступленьня на Беларускае акторскае адзяленьне пры Ленінградзкім тэхнікуме сцэнічных мастацтваў,
што прыймовыя іспыты
па агульна - адукацыйных і спэцыяльных дысцыплінах
адбудуцца
У МЕНСКУ
20-га кастрычніка
пры трэсьце Белдзяржкіно, Савецкая, 90
і у ГОМЕЛІ
23-га кастрычніка
пры аддзяленьні Белдзяржкіно вул. Камунараў 2.
Неабходна зьявіцца на адзін з гэтых пунктаў, гледзячы па тое, дзе месца жыхарства.
Праезд за кошт паступаючых.

У аддзел абвестак — званіце па тэлефону — 2-44.

Трудаўскі птушкаводны тэхнікум
працягвае набор студэнтаў
на 1-шы курс да 1-га лістапада
Умовы паступленьня згодна даведніка НК Асьветы.
Заявы з дакумантамі дасылаць па адрасе: ст. Дрэтунь, п/а Труды, Трудаўскаму птушкаводнаму тэхнікуму.
Дырэкцыя тэхнікуму.

Праектна-канструктарская кантора Будаб'яднаньня НКЛП
паведамляе
усе прадпрыемствы і установы што яна выконвае да бухгуўлічага сэзону 1933 году розныя роду будаўнічыя праекты, як-та эскізныя праекты і рабочыя чарцяжы фабрык, заводаў, грамадзянскіх і грамадзкіх пабудоў; праекты і рабочыя чарцяжы на ацяпленьні, вэнтыляцыі, водаправодзе, каналізацыі і ачышчальных пабудовах а таксама праекты розных сушылак цэглы, дрэва, скуры ды інш. кацельных установак, складаньне кашторысаў ды інш.
Апрача таго, Праектна-канструктарская кантора мае вялікі архіў з розныя готовымі праектамі.
ПРАЕКТНАЯ КАНТОРА

Друкарня імя